ПРАЛЕТАРЫ ЎСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ

ЗЬВЯЗДА

Орган ЦК і Менскага гаркому Камуністычнай партыі (б) Беларусі.

Год выданьня XV
№ 67 (4319)
ЧАЦЬВЕР, 24 сакавіка 1932 г.
МЕНСК, Савецкая 63

Сёньня ў нумары

АРТЫКУЛЫ: ПЕРАДАВЫ — Максымальна разгарнуць і паскорыць таваразварот.

В. ГАНТМАН — ДА праверкі партыйна-масавай работы ў цэху і брыгадзе (3 стар.).

А. СТАЛЕВІЧ — Магутныя клясавыя баі разгортваюцца ў Польшчы (2 стар.).

1 красавіка рапартаваць аб гатоўнасьці да сяўбы.

Сумеснымі намаганьнямі ППС і паліцыі забастоўка ў Дамброўскім басэйне сарвана. (1 стар.).

БАРАЦЬБА БРАЦКІХ КАМПАРТЫЙ — Пад кіраўніцтвам КПП і КПЗБ працоўныя масы гераічна змагаюцца супроць ураду голаду і вайны, за рэвалюцыйны выхад з крызісу. КПЗБ — Кіраўнік рэвалюцыйнай барацьбы рабочых і сялян (2 стар.).

АБ'ЯДНАНЫ ПЛЕНУМ МЕНСКАГА ГАРКОМУ і гарКК КП(б)Б. — Пабальшавіцку падрыхтавацца да будаўнічага сэзону. VII усебеларускі зьезд прафсаюзаў. — Прафсаюзы БССР — у барацьбе за прамфінплян (з дакладу тав. Каменштэйна). Без чаргі грузіць і разгружаць пасеўныя грузы (3 стар.).

АГЛЯД ДРУКУ. — На адным тыдні сем пятніц. — У часе штурмавой дэкады дабіцца перамогі на фінансавым фронце (4 стар.).

Максымальна разгарнуць і паскорыць таваразварот

«Для забесьпячэньня бальшавіцкіх тэмпаў уздыму ўсёй народнай гаспадаркі і лепшага задаваленьня попыту шырокіх мас гораду і вёскі ў адносінах тавару шырокага спажываньня першаступеннае значэньне мае **разгортваньне таваразвароту**» (XVII партканфэрэнцыя). Вось чаму партыя аддае так многа ўвагі рабоце каапэрацыі і штодзённа займаецца пытаньнямі савецкага гандлю.

Савецкі гандаль, таваразварот — гэта арганічная частка тых мерапрыемстваў, што служаць справе сацыялістычнага накапленьня і **«ўзмацняюць матар'яльную базу ўсяго сацыялістычнага будаўніцтва»**.

У дырэктывах на складаньні пляну другой пяцігодкі партыя паставіла задачу «падрыхтаваць адмену нармаваньня водпуску тавараў і замяніць сыстэму цэнтралізаванага разьмеркаваньня разгорнутым савецкім гандлем».

Выраніць гэту задачу можна толькі на аснове ўсямернага разгортваньня таваразвароту і перш за ўсё раздробнага гандлю пры абавязковым і самым суровым захаваньні прынцыпаў гаспадарчага разрахунку, прынцыпаў савецкага гандлю.

Ажыцьцяўляючы майскую адозву і пастанову кастрычніцкага пленуму ЦК УсеКП(б), таваразраводзячая сетка на шай рэспублікі і, у прыватнасьці, спажыўсыстэма, дабіліся колькаснага павялічэньня гандлёвых адзінак. Разгортваецца барацьба за выкарыстаньне ўнутраных рэсурсаў, некалькі паскорыўся таваразварот.

Але гэтыя посьпехі ня могуць быць прызнанымі здавальняючымі ні з пункту погляду ўзросшых патрабаваньняў, ні з пункту погляду нашых магчымасьцяй. Як сыстэма спажыўкаапэрацыі, так і «Белгандаль» перабудоўваюцца **марудна, не змагаюцца як сьлед** за разгортваньне таваразвароту, за поўнае ажыцьцяўленьне прынцыпаў савецкага гандлю ва ўсіх сваіх зьвеньнях. Даволі паказаць на тое, што на самастойны балянс і разьліковы рахунак пераведзена толькі 5.9 проц. сеткі крам. Свой гандальфінплян маюць 86 проц. магазынаў. Індывідуальная зьдзельшчына ўведзена толькі ў 421 магазыне, што складае каля 50 проц. гарадзкой сеткі. Маруднасьць перабудовы асабліва выразна відна пры аналізе прасоўваньня тавараў. За 1931 год план таваразвароту на вёсцы выкананы на 78 проц., па горадзе — на 98,5 проц., а ўсяго — на 87 проц. За 7 дзкад 1932 году агульны плян таваразвароту рэалізован на 70 проц. і асобна па вёсцы — яко 66,6 проц.

Нездавальняючая работа таваразраводзячай сеткі асабліва выпукла відна, калі прасачыць за дынамікай таварных астач.

Яны (таварныя астачы), як правіла, на ўсёй амаль каапэрацыйна-гандлёвай сетцы (выключаючы за апошні час ЗРК) **перавышаюць ліміты.**

На райсаюзах гэтае перавышэньне даходзіла да 42,5 проц., па лесарабкопах — 158 проц., торфрабкопах — 62,1 проц. і ПРК — 13 проц.

За апошні час назіраецца нежаданае зьніжэньне агульнай сумы астач. На сыстэме Белкаапсаюзу сума замарожаных тавараў зьменшылася да 5 мільёнаў на 1 сакавіка супроць 7 мільёнаў руб. на першага студзеня. Па Белгандлі замарожана на 1,5 мільёнаў руб. Але гэтае зьніжэньне настолькі марудное, **што ня ўносіць коль кі-небудзь заметных зьмен** у выкананьне пляну звароту па рэспубліцы.

Размарожваньне тавараў праходзіць вельмі і вельмі марудна. На сёньняшнім месцовых умоў, з канкрэтных патрабаваньняў. Перабудова аптовага гандлю мае на ўвазе **скарачэньне шляху** праходжаньня тавару ад вытворцы да спажыўца. У справе разгортваньня таваразвароту і паляпшэньня рабочага спабжэньня выключную ролю зараз адыгрываюць самазагатоўкі, калгасна-саўгасны гандаль і будаўніцтва савецкіх рынкаў. Гэта — **важнейшыя каналы**, па якіх павінна ісьці ўключэньне дадатковых рэсурсаў у рэчышча **арганізаванага таваразвароту.**

Некаторыя посьпехі (праўда, толькі першыя) дасягнуты ўжо ў галіне самазагатовак. Што-ж датычыць да калгасна-саўгаснага гандлю і савецкіх рынкаў, то тут нічога, або амаль нічога ў БССР яшчэ ня зроблена.

Белкалгасцэнтр ня толькі недаацаніў значэньня калгаснага гандлю, але грубым чынам ігнаруе дырэктывы партыі ў гэтай галіне.

Толькі праз пяць месяцаў пасьля пастановы кастрычніцкага пленуму ЦК УсеКП(б) Белкалгасцэнтр склікаў нараду па калгасным гандлі. Падрыхтоўка і работы гэтай нарады вельмі ярка характарызуюць становішча гандлю і кіраўніцтва ім з цэнтру. Замест выкліканых 32 прадстаўнікоў, зьявіліся толькі 8, дый тыя ня ведалі, аб чым ім гаварыць. **Выявілася, што калгасны гандаль зусім не разгорнут, што аб яго прынцыпах райкалгасаюз і тым больш калгасы ня ведаюць, што ніякіх спроб для разгортваньня работы ніхто з калгассыстэмы** (як у цэнтры, так і ў нізе) **не праявіў.**

Праўда, па лініі Белмалгарадкалгасцэнтру арганізаваны 5 магазынаў. **Але гэта літаральна карыкатура на калгасны гандаль.** Магазыны прадаюць гарэлку, пудру, адэкалён і менш за ўсё вырабы сельскай гаспадаркі.

Нарада прыняла пастанову. Белкалгасцэнтр таксама ўжо даў дырэктыву. **Але ўсё гэта можа застацца пустым гукам, калі ня будуць зломаны бюракратычныя, недапушчальныя адносіны да калгаснага гандлю ў першую чаргу з боку кіраўнікоў Белкалгасцэнтру.**

Усе магчымасьці для разгортваньня калгаснага гандлю ў наяўнасьці. Узяць для прыкладу Менскі раён. У калгасах імя Фалько і іншых ёсьць шмат ліпкаў гародніны і іншых прадуктаў. Райкалгасаюз нічога не зрабіў, каб арганізаваць збыт гэтых прадуктаў на аснове савецкага гандлю.

Патрэбна неадкладна разгарнуць сетку калгасных магазынаў іларкоў, растлумачыць калгаснікам значэньне і прынцыпы гандлю, арганізаваць іх для збыту сваіх **ліпкаў** на аснове савецкай палітыкі цэн.

Разгортваньне самазагатовак, выхад калгасаў на савецкі рынак, арганізацыя калгаснага гандлю павінны разглядацца, як важнейшыя мерапрыемствы, накіраваныя на арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў.

Змагаючыся з «лявацкай» фразай аб пераходзе да «простага прадуктаабмену», аб «адміраньні грошай» ужо на нашай стадыі сацыялістычнага будаўніцтва, перамагаючы спэкулянцкія тэндэнцыі, «пэпманскі дух» партарганізацыі, каапэрацыйна - гандлёвыя ўстановы павінны па-бальшавіцку разгарнуць барацьбу за паскорэньне таваразвароту, за ўкараненьне гаспадарчага разрахунку ў кожную гандлёвую адзінку.

Настойліва ажыцьцяўляючы 6 умоў тав. Сталіна, выганяючы абязьлічку і ўраўнілаўку, усямерна пашыраючы раздробную сетку, зробім кожны магазын, ларок, рынак узорнымі прадпрыемствамі культурнага савецкага гандлю!

1-га красавіка рапартаваць аб гатоўнасьці да сяўбы

ПА ПРЫКЛАДЗЕ КАЛГАСЬНІКАЎ БАЦЬВІНАЎСКАГА СЕЛЬСАВЕТУ РАЗГАРНУЦЬ ВА ЎСІХ СЕЛЬСАВЕТАХ КАЛГАСАХ БАЛЬШАВІЦКУЮ БАРАЦЬБУ ЗА НАСЕНЬНЕ, СТВАРЫЦЬ МОЦНЫЯ ФОНДЫ МІЖРАЁННАЙ І МІЖКАЛГАСНАЙ УЗАЕМАДАПАМОГІ

Раўняцца па ўдарніках Бацьвінаўскага сельсавету

Адозва калгасьнікаў - ударнікаў Бацьвінаўскага сельсавету, Крычаўскага раёну, якая сёньня друкуецца, прадстаўляе вялікай важнасьці дакумант. Адозва паказвае сапраўдны узор барацьбы за с.-г. плян 1932 году. Работа брыгад, арганізаваных пад кіраўніцтвам мясцовай партыйнай апорнай ячэйкі сельсавету, нагляднa паказвае, якіх рэзультатаў можна дабіцца, калі сапраўды мабілізаваць масы калгаснікаў вакол чарговых задач пасеўнай.

Цэнтральнай задачай падрыхтоўкі да веснавой пасеўнай кампаніі зьяўляецца барацьба за насеньне. Калгасная грамадзкасьць Бацьвінаўскага сельсавету невыпадкова канцэнтруе галоўную ўвагу на зборы насеньня. Ухапіўшыся за гэта рашаючае зьвяно, калгасы сельсавету падцягваюць і іншыя адсталыя вучасткі работы.

Праведзеная ўдарнікамі - калгаснікамі самаправерка падрыхтаванасьці да сяўбы за прайшоўшыя некалькі дзён дала вельмі вялікія рэзультаты. Па сельсавеце ўжо сабрана 90 проц. патрэбнага насеньня. Сабраны фонд міжкалгаснай узаемадапамогі ў 37.600 кгр. Няма сумненьня, што ўзятыя калгаснікамі абавязацельствы па другіх паказальніках будуць з посьпехам выкананы палкам і ў тэрмін пад кіраўніцтвам мясцовай партыйнай арганізацыі.

Гэтыя паказальнікі зьяўляюцца лепшым пацьвярджэньнем таго факту, што разгорнутая масавая работа можа даць пасьпяховыя вынікі. Прыклад Бацьвінаўскага сельсавету таксама паказвае, што разважнай аб адсутнасьці насеньня, патрабаваньне насеннай пазычкі і г. д. ёсьць вынік панічных настрояў, нежаданьня арганізаваць масы на мабілізацыю **ўнутраных рэсурсаў** і па сутнасьці справы зьяўляецца апартуністычным нежаданьнем змагацца з кулацка-рвацкімі тэндэнцыямі.

Бацьвінаўскі сельсавет мае права быць аднесеным да ліку перадавых сельсаветаў БССР. Па гэтым сельсавеце павінны раўняцца **ўсе іншыя сельсаветы і раёны.** Задача партыйных, камсамольскіх, зямельных і савецкіх арганізацый — зрабіць адозву калгаснікаў-ударнікаў Бацьвінаўскага сельсавету **здабыткам калгаснай грамадзкасьці і бядняцка-серадняцкіх мас аднасобнікаў усіх раёнаў.** Нізавы друк і ўдарнікі павінны быць ініцыятарамі перанясеньня гэтага вопыту ва ўсе калгасы.

Канкрэтнасьць і апэрацыйнасьць пастаноўкі чарговых задач перад масамі — вось, што павінна быць пакладзена ў аснову работы. Выяўленьне ўсіх недахопаў **і неадкладныя меры да іх зьнішчэньня,** самая рашучая барацьба і бязьлітасная крытыка бязьдзейнасьці паасобных зьвеньняў, паказ дасягненьняў, перанясеньне вопыту перадавых сельсаветаў, калгасаў, раёнаў у адсталыя і шырокае разгортваньне сацыялістычнага спаборніцтва — трэба зрабіць штодзённым мэтадам работы арганізацый.

Павінна быць падхоплена ініцыятыва калгаснікаў Бацьвінаўскага сельсавету аб арганізацыі з 1 па 10 красавіка дэкадніка генэральнай праверкі і пробных выездаў у поле. Перад праверкай павінна быць праведзена шырокая падрыхтоўчая работа, ліквідаваны ўсе недахопы, якія ёсьць у работе па падрыхтоўцы да веснавой сяўбы.

Толькі ў рашучай барацьбе з кулаком і яго агентамі — апартуністамы, мы спаткаем веснавую сяўбу у поўнай гатоўнасьці.

Ліст калгаснікаў-ударнікаў Бацьвінаўскага сельсавету, Крычаўскага раёну

да ўсіх калгаснікаў, батраноў, беднякоў і сераднякоў- днаасобнікаў БССР

Задачы трэцяй бальшавіцкай вясны павінны прыкаваць да сябе ўвагу ўсіх гасьнікаў,е батракоў, беднякоў і сераднякоў — аднаасобнікаў.

Пераход да калектыўнай гаспадаркі даў нам магчымасьць паленьшыць наша матар'яльна - бытавое і культурнае становішча.

На палёх, дзе раней так беспакарана сьвісталі бізуны на нашых сыпінах памешчыкаў Якутовічаў, Сівакораз, дзякуючы кастрычніцкай рэвалюцыі, дыктатуры пралетарыяту, мы свабодна будуем нашу сацыялістычную гаспадарку.

Там, дзе Сталыпін і прычэпкавы імкнуліся насадзіць кулацкія гаспадаркі зараз пабудаваны магутныя калектыўныя гаспадаркі, якія яднаюць звыш 600 бядняцка-серадняцкіх гаспадарак.

Там, дзе з веку ў век на нашых палёх працавала прадзедаўская саха і драўляная барана, зараз аруць і барануюць калгасныя палі трактары, дыскавыя бораны, радковыя сяўкі, складаныя плугі і інш. машыны, якія палягчаюць працу чалавека, павышаюць яе прадукцыйнасьць.

Два гады былі для нас баявым экзаменам, які мы з гонарам вытрымалі. Бальшавіцкі рахунак другой калгаснай вясны намі быў аплачан з перавышэньнем. Мы пашырылі пасеўную плошчу яравога кліну на 25 проц., узьвялі ўраджайнасьць на 10 проц., творку закончылі ў тэрмін і поўнасьцю. Мы ганарымся тым, што свой пралетарскі абавязак перад дзяржавай з гонарам выконваем і перавыконваем. Вось нашы паказальнікі. Плян збожжазагатовак выкананы на 114 проц., ільнавалакна — на 111 проц., бульбы — на 100 проц. Набліжаемся да завяршэньня пляну мясазагатовак, які намі выкананы на 78 проц. Па мабілізацыі сродкаў далёка перавыканалі ўсе пляны. Усе гэтыя посьпехі даюць нам магчымасьць паставіць перад сабой задачу павялічэньня аб'ёму і тэмпаў нашай работы ў надыходзячую трэцюю бальшавіцкую вясну.

Мы ставім перад сабой задачу павялічыць пасеўную плошчу па ўсіх культурах. Па асноўных тэхнічных культурах павялічваем яе да 200 проц., падняць ураджайнасьць палёў па аснове ажыцьцяўленьня аграмаксымуму на мешц, чым на 12-15 проц., а на бульбе да—20 проц. Мы ва ўсю шырыню паставілі перад сабой лёзунг і будзем за яго біцца: **«Ні аднаго гэктара незасеянай пасеўнай плошчы».**

Задачы, што стаяць перад намі ў часе трэцяй бальшавіцкай вясны, вымагаюць ад кожнага з нас максымуму ўвагі, выразнасьці, апэрацыйнасьці і бальшавіцкай падрыхтаванасьці да іх выраша ньня.

Генэральны трохдзённы агляд нашых сіл, праведзены з 16 па 19 сакавіка, паказаў, што многа яшчэ ёсьць недаробак, нявыразнасьці, а часамі і расхлябанасьці на паасобных вучастках, што ў канчатковым выніку адмоўна будзе ўплываць на выкананьне вялізарнейшых задач бальшавіцкай вясны і с.-г. пляну чацьвертага, заключнага году пяцігодкі.

Асноўным і рашаючым недахопам зьяўляецца плённая ссынка насеньня. Плян ссынкі насеньня выкананы на 90 проц. Ня скончан рамонт інвэнтару, не ліквідавана абязьлічка цягавай сілы. Трохдзённік асабліва паказаў, што частка кіраўнікоў калгасаў, ахопленая гасцэвакружэньнем ад першых посьпехаў праведзеных пробных выездаў у поле, аслабіла ўвагу да падрыхтоўкі да сяўбы, што стаіць над пагрозу пляны насеўнай кампаніі.

Трохдзённік таксама паказаў, што перадавыя калгасы ўжо ў аснoўным падрыхтаваны да выхаду ў поле: калгас «Барацьбіт», фэрма № 2 калгасу «На варце», фэрма № 3 калгасу імя Леніна, [illegible]лае падрыхтоўку калгас «Маяк» [illegible]шыя, хаця і ў іх на асобных ву[illegible]гках ёсьць недаробкі.

Мы ставім перад сабой задачу — да 1 красавіка 1932 году ліквідаваць ўсе недаробкі ў падрыхтоўцы да веснавой сяўбы. Для гэтага мы па сваім сельсавеце абвясьцілі з 20 сакавіка па 1 красавіка дэкадзік штурму.

Партыйцы, камсамольцы, калгаснікі і селькоры нашага сельсавету на сваіх сходах безагаворачна пастанавілі, што тэрмін скончэньня ссынкі насеннага фондаў, устаноўлены ЦК УсеКП(б) і СНК СССР — 1 красавіка — павінен быць канчатковым тэрмінам поўнай падрыхтаванасьці выкаду ў поле па ўсіх паказальніках.

Наша прапанова — **1 красавіка ўстанавіць днём рапартаў завяршэньня падрыхтоўкі да сяўбы. З 1 па 10 красавіка абвясьціць дэкаду генэральнай праверкі і пробных выездаў у поле.**

Падрыхтоўка да сяўбы.

Для дапамогі аднаасобнаму сэктару ў падрыхтоўцы да веснавой пасеўнай кампаніі ад усіх калгасаў нашага сельсавету ствараем буксірную брыгаду з 6 лепшых калгаснікаў - ударнікаў і кіруючаем у вёску Касьцюковічы, Касьцюковіцкага сельсавету, якая павінна дапамагчы правесьці наступныя мерапрыемствы:

а) на аснове разгортваньня масавай работы не пазьней 25 сакавіка давесьці да кожнага аднаасобнага двара ў парадку самазабязацельстваў пляны веснавой сяўбы;

б) дапамагчы сельсавету давесьці цьвёрдыя заданьні сяўбы да кожнай кулацка - заможнай гаспадаркі;

в) арганізаваць на кожным 10 двароў аднаасобнікаў пасеўныя тройкі, дапамагчы ім у разгортваньні саспаборніцтва і ўдарніцтва з тым, каб выкананць і перавыкананць пляны сяўбы;

г) дапамагчы разгарнуць шырокую работу па ўліку ачысткі і пратручваньня насеньня і разгарнуць сярод іх работу па мабілізацыі насенных рэсурсаў шляхам рэалізацыі насенных пазык імя конкурсу «Правды»;

д) буксірныя брыгады павінны дапамагчы ім завяршыць усю падрыхтоўчую работу ў аднаасобным сэктары да 1 красавіка з такім разьлікам, каб разам з імі паміж 1 і 10 красавіка правесьці пробныя выезды ў поле разам з масамі калгаснікаў.

Усе нашы каляндарныя пляны і выкананьне іх будзе забясьпечана ў тым выпадку, калі ў аснову ўсёй работы будуць пакладзены камуністычныя мэтады працы ў выглядзе саспаборніцтва і ўдарніцтва.

З гэтай мэтай мы ад усіх лепшых калгасаў у адсталыя вызначаем буксірныя брыгады для перанясеньня вопыту і аказаньня дапамогі ў рабоце. Мабілізуем шырокі рабселькораўскі актыў, ствараем ў кожным калгасе штодзённыя штурмоўкі, якія павінны зьявіцца лепшым арганізатарам мас у барацьбе за падрыхтоўку да сяўбы.

Партарганізацыі і камсамол мабілізуюць сябе поўнасьцю на выкананьне гэтых задач. Камуністы і камсамольцы, лепшыя ўдарнікі - калгаснікі становяцца на чало ўдарных брыгад і асабістым прыкладам паяўляюць паказаць узоры бальшавіцкай барацьбы ў падрыхтоўцы да трэцяй бальшавіцкай вясны.

Мы заклікаем усіх калгаснікаў Савецкай Беларусі па нашым прыкладзе вызначыць канкрэтныя шляхі ліквідацыі недаробак і першага красавіка рапартаваць «Зьвязьдзе» аб сваёй гатоўнасьці да бальшавіцкага выхаду ў поле.

Па даручэньні агульных сходаў калгасаў «Барацьбіт», «Маяк», «На варце», імя Леніна, «Бязбожнік» лепшыя ўдарнікі - калгаснікі.



ВЫТВОРЧАЯ БРЫГАДА-- АСНОЎНАЕ ЗЬВЯНО

СЛУЦАК (Наш кар.)

ЦК УсеКП(б) у сваёй пастанове ад 4 лютага аб чарговых мерапрыемствах па арганізацыйна - гаспадарчым умацаваньні калгасаў, дае зусім ясную дырэктыву аб тым, што «важнейшым зьвяном у арганізацыі працы ў калгасах павінна стаць брыгада. ЦК лічыць мэтазгодным арганізацыю ў калгасах брыгад з пастаянным складам калгаснікаў з тым, каб, як правіла, такія брыгады рабілі ўсе асноўныя сельска - гаспадарчыя работы на працягу ўсяго году на поўных вучастках».

Але ў Мусіцкім сельсавеце гэту дырэктыву зразумелі па-свойму, вярней кажучы, не зусім там ня чыталі. На тэрыторыі сельсавету ёсьць 13 калгасаў. Ні ў адным калгасе брыгады не пабудаваны па вытворчым прынцыпе. Напрыклад, у калгасе «Чырвоны маяк» (у якім ёсьць парт'ячэйка) створаны брыгады аратых і г. д. Пасеўныя вучасткі не прымацаваны да брыгад, таксама як і інвэнтар. Па такім-жа прынцыпе створаны брыгады амаль ва ўсіх калгасах сельсавету.

Гэтыя факты сьведчаць аб самым грубым скажэньні дырэктыў партыі па арганізацыі працы ў калгасах. Дапушчаныя памылкі павінны быць выпраўлены ў самы кароткі час.

Харытончык.

Пасеўтройка, якая ісьцуе на паперы

ГОРКІ. Для кіраўніцтва падрыхтоўкай і правядзеньня пасеўнай кампаніі, як правіла, у Горацкім раёне створана раённая пасеўная тройка. Работу гэтай тройкі характарызуе лепш за ўсё лічба ў 60,6 проц. засынкі насеннфонду, якой дасягнуў раён на сёньняшні дзень.

Тройка ня толькі ня кіруе, але нават ні аднаго разу не сабралася на насяджэньне і не распрацавала пляну канкрэтных дзеньняў.

У выніку такой бязьдзейнасьці трой кі і раённых зямельна - калгасных органаў, становішча падрыхтоўкі да вясны пагражае.

Весткі ў райкалгасаюз паступаюць толькі са 157 калгасаў (усіх калгасаў у раёне 220).

Паводле прыблізных падлікаў на калгасах раёну не хапае насеньня для засеву 3.464 га аўса, 1.267 га гэчменю, 2.432 га бульбы, 913 га гароху і насеньня ільну на 5.746 га.

Арганізацыі раёну ня ўжылі ніякіх захадаў для мабілізацыі ўнутраных рэсурсаў шляхам расяўсюджваньня насеннай пазыкі сярод калгаснікаў з мэтай поўнага забясьпячэньня насеньнем яравога кліну.

Брыгада: **Шэўчук, Кейгеліс, Барэйка, Хадзянкоў, Літон, Балбатовіч, Ласмаў, Іскроў, Малешэўскі Нэймарк.**

СУМЕСНЫМІ НАМАГАНЬНЯМІ ППС І ПАЛІЦЫІ

забастоўка ў Дамброўскім басэйне сарвана

Дзесяткі тысяч сем'яў выкідваюцца на вуліцу

ВАРШАВА, 23. Эканамічны крызіс фашысцкай Польшчы пагыбляецца з кожным днём, ня гледзячы ні на якія «сэзоны» і «кан'юнктуры». Беспрацоўе расьце шалёным тэмпам. Нават паводле ўрадавых перапаменшаных даных колькасьць беспрацоўных пераваліла **352 тысячы.** Кожны тыдзень прыносіць па некалькі тысяч новых беспрацоўных. Прадпрыемствы, якія яшчэ не закрыты, працуюць па дваццаць дні ў тыдзень, а часта і таго менш.

У агульным выніку жыцьцёвы ўзровень шырокіх народных мас зьнізіўся як ніколі дагэтуль. Пакупная здольнасьць упала амаль да нуля. Голад і холад — пастаянны госьць працоўных. Вялізная маса бяздомных людзей расьце. Масавыя высяленьні з кватэр на вуліцы—штодзённае зьявішча.

Сацыял-фашысцкі **«Работнік»** ад 22 сакавіка падае некалькі лічбаў аб высяленьні. Паводле гэтых даных у аднэй толькі **Варшаве асуджаных на высяленьне ў бліжэйшыя дні 8.000 сем'яў, у Лодзі — 4.000, у Віленшчыне—3.000 і ў Любліншчыне — 16.000, разам—31.000 сем'яў.** Трэба адзначыць, што гэта толькі ў двух гарадох і двух ваяводствах. Калі-ж узяць усю Польшчу, дык атрымаем жудасную лічбу ў сотні тысяч асоб асуджаных на бяздомнасьць.

Вось канкрэтна рэзультаты капіталістычнай сыстэмы і гаспадараньня фашысцкай дыктатуры ў Польшчы. Зразумела, што гэтыя жудасныя лічбы галечы зусім не перашкаджаюць польскім імпэрыялістам у той-жа час асыгноўваць **сотні мільёнаў злотых** на падрыхтоўку інтэрвэнцыі супроць СССР.

Крывавая сутычка сялян з паліцыяй

ВІЛЬНЯ, 22. Гэтымі днямі вёска **Зурыхі** (Віленшчына) была арэнай крывавай сутычкі сялян з паліцыяй.

Калі ў вёску прыйшла група паліцэйскіх з камэндантам **Адамам Лагуном** на чале, каб правесьці падатковую экзэкуцыю, сяляне спаткалі экзэкутараў і асабліва **Лагуна,** вядомага ў ваколіцы **паліцэйскага-ката** прадам каменьняў. Паліцыя пачала пагражаць зброяй, што выклікала новы выбух абурэньня. Вялікі натоўп сялян зноў закідаў паліцыю каменьнямі і кілямі. Паліцыя стрэліла ў натоўп. Але толькі пасьля некалькі заўпаў сяляне былі расьсеяны. Ёсьць параненыя.

У часе сутычкі былі зьбіты ўсе паліцэйскія і асабліва цяжка камэндант Лагун. На месца выпадку выехала спэцыяльная сьледчая камісія. Праведзены арышты.

Бастуе 1000 чал.

ВАРШАВА, 21. У рэзультаце здрадніцтва сацыял-фашыстаў, якія пры дапамозе паліцэйскіх рэпрэсій і тэрору арганізавалі і ўзначалілі штрэйкбрэхэрства, большасьць рабочых Дамброўскага басэйну, даведзеная за час забастоўкі да надзвычайнай галечы, прыступіла да работы. Бастуе каля тысячы чалавек.

Масавыя арышты і катаржныя прысуды

ВАРШАВА, 22. У **Велюні** (Лодзінскае ваяводзтва) скончыўся працэс 20 рабочых, арыштаваных у сувязі з крывавымі дэманстрацыямі ў мінулым годзе.

З 20 абвінавачаных **6 асуджаны да розных тэрмінаў турмы,** рэшта апраўданы.

Паводле паведамленьня «Кур'ера Варшаўскага» ў Самборы (Зах. Украіна) ахранка правяла вобыскі ў раду асоб, западазроных у прыналежнасьці да украінскага «Сельроба». Некалькі чалавек арыштавана.

Катаржны прысуд над рабочымі ў Грудзёндзы

ВАРШАВА, 22. У **Грудзёндзы** (Паморэ) скончыўся працэс 11 рабочых абвінавачаных у прыналежнасьці да кампартыі. **Галоўны падсудны засуджаны на 8 год катаргі і пяць — па 5 год.** Іншых падсудных, з прычыны адсутнасьці доказаў віны, суд прымушан быў апраўдаць.

Да водзыву ўдарнікаў „Правды" і членаў радніцкіх фабрычна-заводзкіх штодзённік і шматтыражак.

24 сакавіка, у памяшканьні Дому Камасьветы

АДБУДЗЕЦЦА

1-ШЫ МЕНСКІ ЗЬЛЁТ УДАРНІКАЎ „ПРАВДЫ"

разам з членамі радніцкіх фабрычна-заводзкіх штодзённік і шматтыражак, упаўнаважаных партыкамітэтаў і ячэек па масавай рабоце вакол „ПРАВДЫ".

ПАРАДАК ДНЯ:

даклад прадстаўніка рэд. газ. „ПРАВДА" т. Гарэліка аб чарговых задачах ударніцтва ў другу.

Пасьля дакладу—настаўная частка.

Пачатак роўна ў 6 гадз. вечч. Уваход па разданых білетах. Тых, што не атрымалі білетаў, могуць атрымаць іх у паўпрэдстаў рэд. „Правды" (Менск, Савецкая, 61).

Уўпрэдства рэд. газ. „ПРАВДА" па БССР.

Барацьба брацкіх кампартый

ПАД КІРАЎНІЦТВАМ КПП І КПЗБ

працоўныя масы гераічна змагаюцца супроць ураду голаду і вайны, за рэвалюцыйны выхад з крызісу

супроць падрыхтоўкі новай імпэрыялістычнай бойні, у абарону СССР, у абарону Кітайскіх Саветаў

Магутныя клясавыя баі разгортваюцца ў Польшчы

У Польшчы на фоне гаспадарчага крызісу, які ўсё больш і больш абвастраецца, насыпваюць вялікія бурлівыя падзеі, разгортваюцца магутныя клясавыя баі. Осьсьвечны эканамічны крызіс з асаблівай вострасьцю выступае ў Польшчы. Паглыбленьне крызісу ў Польшчы выяўляецца ў тым, што ён **ахапіў асноўныя галіны прадукцыі** — металоргічную, машынабудаўнічую і інш. Вугольная прамысловасьць знаходзіцца ў крытычным становішчы. Поўнай нагрузкай працуе толькі ваенная прамысловасьць.

Катастрафічна абвастраецца і аграрны крызіс. Нябывалае паданьне цэн на прадукты сельска - гаспадарчыя, асабліва жывёлагадоўлі, узмоцнены падатковы прэс і ўся палітыка фашысцкага ўраду давяла масы да голаду. На рынку выпадкі, калі селяніны, прывёзшы на рынак для продажу жывёлу, адыходзяць не за бесцэнь, або пакідаюць на рынку з-за недахвату корму.

Абвастраецца і фінансавы крызіс, расьце дзяржаўны дэфіцыт, ня гледзячы на скарачэньне бюджэту, праведзенае за кошт працоўных мас, ня гледзячы на ўзмоцнены падатковы прэс. Спробы ратаваць гандлёвы бальнс шляхам выдумваньня розных мытных перашкод, узмацняюць дэмпінг, пазбаўляюць дарагоўлю на ўнутраным рынку, грабежніцтва зарплаты рабочых. На сотай глебе ўзрастае незадаволенасьць такога сярод шырокіх пластоў прыватнай буржуазіі, служачых дзяржаўных устаноў, камунальных служачых і г. д.

Гаспадарчы крызіс на Заходняй Беларусі выступае **з большай сілай** у выніку грабежніцкага гаспадараньня польскага імпэрыялізму, у выніку ліквідацыі пакрыхтоўкі да нападу на СССР, якая з большым пяжарам кладзецца на ЗБ, як на плацдарм нападзеньня на СССР. Прамысловасьць Заходняй Беларусі **дайшла да поўнага ўпадку.** Зрэшчавана рэмесьніцтва і самагужніцтва. Пенша і галеча працоўных мас гораду і вёскі, ахопленых беспрацоўем і голадам, завастраецца з кожным днём. Галодныя, абшарпаныя, сотні тысяч працоўных мас, асуджаныя на галодную сьмерць, слаяюцца на запыпалым краі, - ахопленым выбухам гаспадарчым крызісам.

Фашысцкі ўрад ня хоча і ня можа ісьці з дапамогай працоўным масам. Наадварот, у апошнія часы з пячуваньнем выхабасьцю і жорсткасьцю ўрад капіталістаў і памешчыкаў павёў наступленьне на працоўныя масы, крывава распраўляецца з усякім праяўленьнем адпору эксплёатацыі, бо ён пасылае карныя экспэдыцыі. У [illegible] цэлы рад закопаных [illegible] канчаткова ліквідуючы сацыяльных заваяваньняў рабочае клясы, павялічваюць рабочы дзень, забараняюць масавыя выпадкі і г. д. Цэлыя атакі накіраны адначасова супроць прамысловага і сельска - гаспадарчага пралетарыяту, супроць працуючых і беспрацоўных. Катастрафічна ўзрастае беспрацоўе, якое ахапіла большасьць пралетарыяту. Асабліва востра выступае беспрацоўе на вёсцы, дзе беспрацоўныя - пазбаўлены ўсялякай дапамогі.

Расцучыся ад крызісу і бурна ўзрастаючая рэвалюцыйнага руху, польская буржуазія ліхаманкава рыхтуецца да нападу на СССР. Польскія газэты адкрыта пацкоўваюць Японію да нападу на СССР, адкрыта кажуць аб неабходнасьці ўстанаўленьня межаў Польшчы да 1772 году. Урад заключае дагаворы з беларускай і украінскай буржуазіяй аб стварэньні ўжо цэнтр - рэвалюцыйных узброеных атрадаў пад камандай польскага генштабу. Зьлятаюцца і арганізуюцца балахоўскія і пятлюраўскія банды. Ня гледзячы на тое, што ўрад Пілсудзкага падпісаў з СССР пакт аб ненападзе, аднак, падрыхтоўка да вайны і розныя антысавецкія ваенныя махінацыі выступаюць у апошнія часы з нябывалай яркасьцю. Прадстаўнік урадавай партыі ББ **сэнатар Выростак** публічна заяўляе, што «рыскі трактат не зрабіў разрахунку» з краем дыктатуры пралетарыяту. З мэтай пашырыць ваенную базу супроць Савецкага Саюзу польскі імпэрыялізм рыхтуе замах на Данцыг, на Літву.

Важнейшым сродкам фашысцкага ўраду ў задушэньні рэвалюцыйнага руху і падрыхтоўцы вайны **зьяўляецца белы тэрор.** Расстрэлы дэманстрацый беспрацоўных, забойствы рабочых на фабрыках, карныя экспэдыцыі па вёсках, ЗБ і ЗУ, пакараньне сьмерцю рэвалюцыянэраў, прыдушэньне найменшага праяўленьня рэвалюцыйнага руху і апазыцыйнасьці нацыянальна-вызваленачага руху, рабоча - сялянскай прэсы — вось штодзённыя праяўленьні спанаваньня фашысцкай дыктатуры ў Польшчы.

Аднак, ня гледзячы на разьюшаны белы тэрор, на жалезныя ціскі фашысцкага рожыну, рэвалюцыйны рух рабочых і сялян, пад кіраўніцтвам кампартыі, бурна ўзрастае і ў апошнія часы набыў **магутныя формы клясавых баёў.** З асаблівай сілай выступаюць **забастовачныя баі пралетарыяту ў Польшчы.** Няма гораду, няма фабрыкі, дзе-б ня ўзьнікла ўпартая, бурлівая забастоўка, дзе-б не адбывалася баявая дэманстрацыя беспрацоўных мас. Месячная забастоўка 38 тысяч гарнякоў сваім выразным, палітычным характарам нанесла магутныя ўдары па фашысцкай дыктатуры. Рабочыя высоўваюць новыя формы барацьбы супроць капіталістаў. Прыклад зьяўляецца забастоўка рабочых на фабрыцы «Гартэнзія», якую па працягу некалькіх тыдняў рабочыя трымалі ў сваіх руках, адбівалі атакі паліцыі, праганялі штрэйкбрэхэраў, акапаліся на фабрыцы, як у крэпасьці.

16 сакавіка пралетарыят Польшчы ў ліку 200 тысяч распачаў забастоўку пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі і, наперакор манэўрам ППС працівесьці забастоўку, як «спакойны пратэст», разгарнуў магутны бой супроць фашысцкай дыктатуры голаду і вайны. Наперакор ППС баставалі рабочыя ваенных заводаў, чыгуначных варштатаў у Кракаве, Львове, Варшаве і Вільні. Чыгуначнікі затрымалі 6 цягнікоў.

У Кракаве 16 сакавіка магутная дэманстрацыя рабочых прагнала пэнэсаўскага мясцовага верхавода Шумскага і пад сьцягамі кампартыі са сьпевам «Чырвонага сьцягу» рушыла па горадзе. Налёт паліцыі на дэманстрацыю быў адбіт рабочымі пры дапамозе сваёй самаабароны камень-мі. І толькі прыбыўшыя аддзелы конпай паліцыі паўторнымі атакамі разагналі дэманстрацыю. У выніку шмат параненых. Цяжка зьбіты 4 паліцэйскія.

У Жыўцу ў той - жа дзень шматтысячная дэманстрацыя рабочых рушыла да будынку староства. Дарогу перагарадзіў аддзел паліцыі, але дэманстранты атакавалі паліцыю, кідаючы каменьні, цэглу, палкі, а таксама абстрэльваючы яе. Прыбыўшы аддзел паліцыі папярэдзіў дэманстрантаў, што будзе страляць, калі не разыдуцца. У адказ рабочыя, крыкнуўшы «ура», кінуліся на паліцыю і разагналі яе за ўсе боскі. Пасьля схваткі 4 паліцэйскія былі паранены, сярод рабочых быў адзін забіт, а 2 параненых.

На Заходняй Беларусі таксама пралетарыят праводзіць усюды забастоўкі супроць наступленьня капіталу. На даўна ў Белавежы, Гайнаўцы, Нурцы адбылася 3-тыднёвая забастоўка 400 тартачнікаў. Забастоўка прайшла пад кіраўніцтвам кампартыі. Верхаводы з ППС усялякімі дэмагагічнымі манэўрамі і «левымі» фразамі хацелі падпыц па пад рэвалюцыйны настрой тартачнікаў. Пэнэсаўскі пасол Дзюбуа выступіў па адным з мітынгаў тартачнікаў з лёзунгам: «Няхай жыве Чырвоная Беларусь». Аднак, тартачнікі, навучаныя здрадай пэнэсаўцаў, прагналі Дзюбуа. Забастоўка тартачнікаў была выйграна. У Беластоку адбылася агульная однадзённая забастоўка ў знак салідарнасьці з забастоўкай гарнякоў у Дамброве. 16 сакавіка баставаў увесь пралетарыят Беласточыны. У Вільні баставала звыш 2.000 рабочых (частвова на чыгуначных майстэрнях, каналізацыйныя рабочыя, фабрыка алею і інш).

Ажыўленьне забастовачнага руху пралетарыяту, бязумоўна, паслужыць фактарам узмацненьня сялянскага рэвалюцыйнага руху, які таксама набывае ўсё больш востры, масавы і арганізацыйна формы. Па прыкладзе чырвонай Берасьцейшчыны працоўныя сяляне ўсёй Заходняй Беларусі разгортваюць барацьбу масавага адмаўленьня ад выплаты падаткаў, выхаду на шарваркі, барацьбу супроць пацыянальнага ўціску, супроць белага тэрору.

Ня гледзячы на фашысцкі тэрор, які бязумоўна яшчэ больш узмоцніцца, наперакор «левай» фразэалёгіі і манэўрам сацыял - фашызму, кампартыя з ўсё большай самастойнасьцю кіруе рэвалюцыйнай барацьбой рабочых і сялян, непакіена вядзе іх па шляху да чырвонага Кастрычніка за ўсёй Польшчы, заклікаючы пасьледоўнасьць рэвалюцыйнаму прыкладу рабочых і сялян былой Расіі, прапагандуючы дасягненьні сацыялістычнага будаўніцтва, мабілізуе працоўныя масы на аснове барацьбы за свае штодзённыя патрэбы, за рэвалюцыйны выхад з крызісу, за зьвяржэньне фашысцкай дыктатуры, імпэрыялістычнай польскай акупацыі ЗБ і ЗУ, за дыктатуру пралетарыяту.

А. СТАСЕВІЧ.

Мітынг супроць вайны ў Вільне

12-га лютага ў адным з раёнаў Вільні адбыўся мітынг барацьбы супроць вайны. На мітынгу было каля 300 чал. Уся маса, прысутная на мітынгу, і паасобныя групы рабочых, якія прахадзілі ў гэты час тут, уважліва прыслухоўваліся да выступленьняў працоўцы, уважліва разглядалі і чыталі транспаранты, на якіх былі лёзунгі, накіраваныя супроць імпэрыялістычнай вайны, у абарону СССР. Мітынг прахадзіў недалёка ад казарм, і салдаты уважліва прыглядаліся і прыслухоўваліся да ўсяго, што адбывалася. Калі шпік сатрыкаў адкуды з чатоўцу, дык рабочыя другна адбілі арыштаванага. На масоўцы была распаўсюджана літаратура.

ПРАЛЕТАРЫ ВАРШАВЫ ДАЮЦЬ АДПОР ФАШЫСЦКІМ ГРАБЕЖНІКАМ

ВАРШАВА. Кампанія фашысцкага ўраду па пераклядваньні цяжару на ўтрыманьні беспрацоўных на плечы рабочай клясы натыкаецца на адпор рабочых, асабліва на металоргічных заводах у Варшаве. На фабрыцы «Шкода» (выраб матораў для самалётаў) дырэкцыя фабрыкі патрабавала ад дэлегата, каб ён згадзіўся пісьмова на вылічэньне з зарплаты рабочых 1 проц. для беспрацоўных. Дэлегат адмовіўся. Дырэкцыя зарэв - жа пастанавіла пазбавіць яго фучкцый дэлегата, зазначыўшы, што прагоніць такога дэлегата, які ня будзе выконваць яе патрабаваньняў. Аднак, рабочыя заявілі, што яны не згаджаюцца на зьмену дэлегата. На заводзе зброі на цытадэлі быў зьнешен таксама дэлегат за тое толькі, што не хацеў згадзіцца на вылічэньне часткі зарплаты рабочых «на карысьць беспрацоўных».

На форце Бэма дэлегат падпісаў такую згоду на вылічэньне часткі рабочай зарплаты, але калі аб гэтым даведаліся рабочыя, дык моцна зьбілі яго.

Есьць шмат выпадкаў запазьчанасьці фабрык па выплаце зарплаты рабочым па некалькі месяцаў.

На зазначаным вышэй фабрыцы «Шкода» запрапанавана рабочым падпісаць згоду на дзесяцідзённы бясплат ны водпуск (каб ня нелі права на дапамогу), а калі рабочыя не згадзіліся, кіраўнікі закрылі фабрыку на два з паловай месяцы. Як вядома, забастоўка камунальных рабочых была задушана пры дапамозе пэнэсаўска-бэсэсаўскіх бандаў. Ім адно з патрабаваньняў, падпісаных майстэрам, ня было выканана. Забастовачныя настроі растуць.

Камунальным рабочым у Варшаве, шпітальным рабочым, гарадзкім, каналізацыйным і ў тэхнічным аддзеле ўжо па 3-4 тыдні не выплаціць пэнсіі. У некаторых галінах працы магістратам падрыхтоўваецца скарачэньне рабочых, а таксама перавод рабочых на ніжэйшыя катэгорыі. Пажарнікам выплачваюць, але падрыхтован ужо сьпіс некалькіх дзесяткаў да звальненьня. У тэхнічным аддзеле ад 1 лістапада зволена 200 рабочых з тым, каб праз 2 тыдні прыняць іх зноў на работу, але з зарплатай на дзіве катэгорыі ніжэй (па 2 злотых у дзень), звольненых - жа тэхнічных рабочых прымаюць на тройдзённы тыдзень працы. Сэзонныя рабочыя, якія звальніліся з 1 та д'етанада, скінуты былі на работу да 1 сьнежня. Аднак, гэтыя **ўступкі магістрату адбыліся пад націскам баявой дэманстрацыі тысячы рабочых.**

Трамвайшчыкі, якім зарплата зьніжана на 3 проц., рыхтуюцца, пад кіраўніцтвам прафсаюзнай нявіцы, зноў да забастоўкі.

Паліцэйскія карэтні разьязджаюць па ўсім горадзе, асабліва па рабочых і яўрэйскіх кварталах. Выпадкам гэтых абмоў зьяўляецца часта па 200 і больш арыштаваных. Часта такія арышты адбываюцца адначасова ў некалькіх пунктах гораду. Усё больш часта «пацыфікацыі» натыкаюцца на адпор з боку мас. На вуліцы Казімера, калі прыбыла каротка і паліцыя пачала зьдзекавацца з праходжых, дык жанчыны закідалі яе буракамі і бульбай. За Жалезнай Брамай у часе «пацыфікацыі» сабралася каля 200 чалавек, якія сваім баявым выступленьнем прымусілі паліцыю ўбрацца.

Забастовачная барацьба на тартаках у Белавежы і Гайнаўцы

Кіраўніцтва дзяржаўных тартакоў у Гайнаўцы, Нурцы і Белавежы зьнізіла зарплату рабочым ад 30 да 60 проц. Рабочыя не згадзіліся працаваць за галодную зарплату (ад 1,20 да 1,80 злотых у дзень) і забастовалі. Некалькі тыдняў змагаліся рабочыя ў Гайнаўцы, Нурцы і Белавежы. Змагаліся ўпарта, хаця ў хаце ня было кавалка хлеба, хаця дзьвія месяцы былі беспрацоўнымі, бо тартакі аднаелі працу толькі тры тыдні назад.

Фашысцкая ўлада ўсімі сіламі старалася зламаць забастоўку. Лясьнік Шуба, кіраўнік тартака ў Нурцы патражалі рабочым рэвальвэрамі. У Белавежы дырэкцыя для стэрарызаваньня рабочых абвясьціла, што яна закрывае тартак, а адначасова пачала шукаць штрэйкбрэхэраў сярод вакольных сялян. Абурэньне бастуючых супроць фашысцкай улады вялізарнае. На дапамогу фашысцкай уладзе тут, як і ўсюды, зьявіліся верныя дзіткі ўраду — сацыял - фашысты — **паны Дзюбуа і іх мясцовыя памочнікі — Посэк і Лазны.** Часова захапіўшы кіраўніцтва забастоўкай у свае рукі, яны імкнуліся сьпінуць бастуючых са шляху барацьбы, пасеяць сярод іх ілюзіі аб тым, што **ваяўна ўмяшанча** ваяводства, а перш за ўсё міністэрства і «скончыць з эксплёатацыяй рабочых».

Аднак, рабочыя не паддаліся на вуду сацыял - фашыстаў. **Пад кіраўніцтвам кампартыі бастуючыя дабіліся задаваленьня ўсіх выстаўленых патрабаваньняў.**

Дэманстрацыя беспрацоўных у Беластоку

На працягу сьнежня і студзеня ў Беластоку адбылося шмат мітынгаў і дэманстрацый беспрацоўных. У часе дэманстрацый беспрацоўных шаўцоў адбыліся крывавыя сутычкі з паліцыяй, якая арыштавала некалькіх беспрацоўных, саме пад націскам мас пры мушана была іх вызваліць.

11 сьнежня адбыўся мітынг 400 беспрацоўных. ППС запрапанавала паслаць дэлегацыю да ваяводы. Аднак, беспрацоўныя на другі дзень наладзілі дэманстрацыю перад біржай працы і прымусілі ўладу выдаць ім карткі па абед, нуталь і бульбу. 23 сьнежня дэманстрацыя беспрацоўных пад рэвалюцыйным кіраўніцтвам дабілася выдачы ім прадуктаў на сьвята. Калі 24 сьнежня ў залі ППС адбыўся мітынг беспрацоўных, дык ППС'ёўцы не хацелі дапусьціць выбараў камітэту беспрацоўных, а толькі кантрольную камісію, на чале якое стаў ППС'авец Мізер.

5 студзеня адбыўся зноў мітынг беспрацоўных. Стары камітэт, складзены з пэнэсаўцаў, выступіў супроць дэманстрацыі і нашоў у адстаўку. Беспрацоўныя выбралі новы камітэт, складзены з рэвалюцыйных рабочых. Пасьля гэтага работы выйшлі на вуліцу масавай дэманстрацыяй. Адбылася доўгая і вострая барацьба з паліцыяй. У часе гэтай барацьбы салдаты выступілі на баку беспрацоўных, супроць паліцыі.

Рэвалюцыйныя настроі ў вёсцы растуць

ПІНСК. У канцы мінулага году ў вёску **Новы-Двор,** Лагішынскага раёну, прыехалі спаганяць падаткі войт, сэквэстратар і два паліцэйскія. Забралі 12 кароў, але сяляне адбілі іх.

На другі дзень прыехаў ужо атрад паліцыі і ад сялян адабралі зноў кароў, загналі іх да солтыса ў двор і пасадзілі там гуляцку. У гэты момант сяляне падпалілі будынкі солтыса і разабралі сваіх кароў. Калі адзін паліцэйскі вельмі стараўся тушыць і прымушаў да гэтага і сялян, дык адзін 19-гадовы хлапец яго так «агрэў» па галаве, што ў таго ўсякая ахвота адпала далей тушыць. Хлапец быў за гэта арыштаваны і замучаны на паліцэйскім пастарунку.

У в. **Падгорадзе** быў паранен памочнік. Лясному [illegible] — шпіку — спалілі ўсе [illegible] сена. У вёсцы **Коўпяціна,** гэтага-ж раёну, аднаму шпіку з сялян таксама спалілі ўсе стагі сена. 1 жніўня мінулага году вакол Лагішына былі перарэзаны ўсе тэлефонныя драты і зрэзаны слупы.

Ад Берасьцейшчыны не адстае і Слонімшчына. Нездаваленьне супроць акупантаў расьце. У адным вёсцы ў дэманстрацыі ў гадавіну Кастрычніцкай рэвалюцыі прымала ўдзел усё насельніцтва. Іншы на дэманстрацыю са сьцягамі і чырвонымі бантамі. У вёсцы **Шуляні** забілі зьмясьнічага памочніка Чапскага за тое, што ён прасьледаваў сялян. У вёсцы **Міньханаў-ка** сялянамі забіт шпік. У вёсках **Савічы, Чанелава і Шылавічы** была праведзена пробная рэгістрацыя насельніцтва. Сялянства перапіс байкатавала. За гэта ўсе сяляне аштрафаваны.

Рэвалюцыйныя настроі ў заходняй-беларускай вёсцы растуць. Сялянства масамі адмаўляецца ад выплаты падаткаў, ад шарваркаў; падатковых экзэкутараў гоняць вон. На гэтай глебе адбываюцца частыя крывавыя сутычкі паміж сялянамі і паліцыяй.

Работніца у поршых радох

У Вільні беспрацоўныя жанчыны складаюць адну трэцюю частку ўсіх беспрацоўных. Беспрацоўныя не атрымліваюць амаль ніякай дапамогі і літаральна галадаюць. У студзені беспрацоўныя жанчыны, сабраўшыся, выбралі дэлегацыю і пакіраваліся да ваяводы ўсёй масай з патрабаваньнем дапамогі і працы. Выступленьне адбывалася пад кіраўніцтвам выбранага камітэту беспрацоўных жанчын. Ля староства паліцыя перагарадзіла ім дарогу і разагнала.

Жанчыны сабраліся другі раз і накіраваліся да біржы працы. У гэты момант перад біржай быў вывешан чырвоны транспарант. Беспрацоўныя хлынулі да яго вялізарнай масай. У гэты час паліцэйскі затрымаў чалавека на падазраньні ў вывешваньні транспаранту. Беспрацоўныя заступіліся за арыштаванага, вырвалі яго з рук паліцэйскага і схавалі ў натоўпе. Беспрацоўныя пачалі зьдзекавацца з паліцэйскага, углядаючыся, як ён скакаў, каб зьняць транспарант. Паліцэйскі пярэпаце, зьняў транспарант. Беспрацоўныя яго акружылі і патрабавалі даць ім пачытаць, што там напісана. Гаворачы: «Гэта не для цябе напісана, а для нас». Пад націскам паліцэйскі прымушан быў даць прачытаць. У гэты момант падасьпеў атрад паліцыі і шпікоў, які разагнаў беспрацоўных, арыштоўваючы некаторых з іх.

Аб'яднаны пленум Менскага гаркому і гарКК КП(б)Б

Па-бальшавіцку падрыхтавацца да будаўнічага сэзону

На другім пасяджэньні 20-га сакавіка аб'яднаны пленум Менскага гаркому і гарКК КП(б)Б абмеркаваў даклад т.т. **Васэрмана і Пінхасіка аб ходзе падрыхтоўкі да будаўнічага сэзону** ў прамысловасьці і камунальнай гаспадарцы.

Падрыхтоўка да будаўнічых работ праходзіць далёка невыстарчальнымі тэмпамі, што ставіць пад пагрозу выканальне будаўнічых пляваў 1932 г.

У будаўнічых арганізацыях да гэтага часу адсутнічаюць пляны работ і іх чарговасьць. Няма належных праектаў, чарцяжоў, ня вызначаны вучасткі для пабудоў. Органы Наркамправы і бударганізацыі зусім мала ўвагі аддаюць пытаньню вярбоўкі рабочай сілы, стварэньню належных бытавых умоў для рабочых.

У спрочках па дакладах т.т. Васэрмана і Пінхасіка выказаліся т. т. **Кавальчук, Мацюкоў, Халадзінскі, Домараў, Мееровіч, Кеніг, Верхалеўскі** і іншыя.

Аб'яднаны пленум у сваёй пастанове па пытаньні аб падрыхтоўцы да будаўнічага сэзону 1932 г. вызначыў рад практычных мерапрыемстваў, ажыцьцяўленьне якіх забясьпечвае пасьпяховае выканальне будаўнічай праграмы.

— Неадкладна закончыць заключэньне дагавораў, расклясьці будаўнічэ-фінансавыя пляны па месячным і дэкадным заданьні, якія давесьці да кожнай брыгады і рабочага.

— Разгарнуць работы па зьніжэньні сабекошту будаўніцтва і павышэньні яго якасьці, зрабіўшы гэта цэнтральнай задачай будаўнічых арганізацый. У бліжэйшы час вырашыць і ажыцьцявіць задачу пераводу работ на будаўніцтве і па вырабе цэглы на бесьсоранышны год.

— Будаўнічыя арганізацыі павінны забясьпечыць будаўніцтва кваліфікаванымі кадрамі; пакласьці ў аснову забясьпячэньня будаўніцтва рабочымі арганізаваны набор рабочай сілы.

— Усе пабудовы павінны быць пораведзены на гаспадарчы разрахунак.

— Дабіцца карэннага пералому ў справе палепшэньня сацыяльна-бытавых умоў рабочых на будаўніцтве.

— Важнейшай умовай пасьпяховага правядзеньня будаўнічых работ аб'яднаны пленум лічыць узмацненьне партыйна-масавай работы на будаўніцтве шляхам перанясеньня цэнтру цяжару яе непасрэдна на пабудову, у пізавыя зьвенні вытворчасьці, ажыцьцяўленьня 6 умоў тав. Сталіна.

КПЗБ—кіраўнік рэвалюцыйнай барацьбы рабочых і сялян *)

Выходзячы з задач і тактычных указаньняў, даных III пленумам ЦК КПП і V пленумам ЦК КПЗБ, ЦК падкрэсьлівае, што гэтыя задачы азначаюць цьвёрдую ўстаноўку партыі на пашырэньне фронту барацьбы, максымальную арганізаванасьць, аб'яднаньне барацьбы на паасобных вучастках рэвалюцыйнага фронту і канцэнтрацыю сіл на асноўных вучастках барацьбы; падняцьце актыўнасьці і баяздольнасьці ўсёй партыі ў цэлым і кожнага не паасобнага зьвяна. Гэта адзіны шлях, на якім партыя здолее адбіць атакі і ўдары клясавога ворага, здолее лакаць і ўзрываць абвостра чы рэжым фашысцкага тэрору, узьняць барацьбу мас на вышэйшую ступень, арганізаваць контр-наступленьне мас супроць фашысцкай дыктатуры і акупацыі і падвесьці іх да непасрэднай барацьбы за ўладу.

Значнае адставаньне партыі на паасобных вучастках патрабуе згуртаваньня намаганьняў усёй партыі і кожнага не члена на перамаганьне намыжак і недахопаў.

Для гэтага патрэбна:

1. Максымальнае напружаньне сіл па мабілізацыі мас на барацьбу супроць вайны, якая арганізуецца фашысцкім урадам, у абарону СССР, шляхам арганізацыі актыўных выступленьняў у сувязі з кожным канкрэтным фактам, які сьведчыць аб узросьце гэтай небясьпекі.

Узмацненьне працы ў арміі сярод салдароных (навабранцаў), сярод фашысцкіх вайсковых і поўвайсковых арганізацый, таксама па пранікненьні ў прадпрыемствы, якія маюць рашаючае значэньне ў часе вайны (у першую чаргу чыгуначнікі, рабочыя рэчнага транспарту, камунальныя прадпрыемствы і г. д.).

2. Узмацненьне самастойнай ролі партыі ў арганізацыі барацьбы пралетарыяту, узмацненьне пралетарскай базы партыі, а таксама ўзьняцьце кіруючай ролі пралетарыяту ў барацьбе шырокіх народных мас ЗБ супроць акупацыі. У галіне заваяваньня рашаючай большасьці пралетарыяту галоўная ўвага партыі павінна быць накіравана на разгортваньне і арганізацыю шырокага забастовачнага руху і барацьбы беспрацоўных у іх цесная узаемная увязка. Барацьба супроць рэдукцый, паніжэньня зарплаты, за яе павялічэньне, за 7-мігадзінны рабочы дзень, неадлучна ад барацьбы за дзяржаўную дапамогу ўсім беспрацоўным. Забастовачная барацьба—гэта асноўная форма барацьбы пралетарыяту, якая ў сучасных умовах асабліва спрыяе разварушваньню і ўзьняцьцю актыўнасьці ўсіх іншых пластоў працоўных мас — павінна злучацца з арганізацыяй масавых дэманстрацый і барацьбы за вуліцу, з супольнымі выступленьнямі працуючых і беспрацоўных. Ва ўмовах, калі ўсякае выступленьне рабочых мас у абарону іх штодзённых патрэб нямінуча сустракаецца з завостраным фашысцкім тэрорам і прыводзіць масы да непасрэдных сутычак з дзяржаўным апаратам, мы больш чым калі-небудзь маем наяўнасьць прадпасылак для перарастаньня эканамічных баёў у палітычныя забастоўкі. Пры арганізацыі забастовачнай барацьбы неабходна выкарыстаць усялякія формы барацьбы ў залежнасьці ад ступені актыўнасьці мас і іх баявой гатоўнасьці (як італьянская забастоўка, захват фабрык, адмаўленьне ад выхаду з фабрыкі ў часе масавых рэдукцый і лёкаутаў), маючы выразную ўстаноўку на арганізацыю забастоўкі і пашырэньне яе на іншыя прадпрыемствы дапага гораду, аж да ўсеагульнай забастоўкі. Гібкія манэўры саныял-фашыстаў вымагаюць тыла больш чуласьці для забясьпячэньня поўнай самастойнасьці партыі ў арганізацыі забастовачнай барацьбы, вымагаюць уклала здмаскаваньня гэтых манэўраў на канкрэтных фактах і базьлітаснай барацьбы з апартуністамі у нашых радох.

Пры арганізацыі барацьбы беспрацоўных і неадлучнай ад яе барацьбы супроць рэдукцый, асаблівую ўвагу неабходна зьвярнуць на дэмаскаваньне фашысцкай філянтрапічнай акцыі дапамогі беспрацоўным і манэўраў, накіраваных на разьбіваньне фронту працоўных, пытаньням мабілізацыі мас беспрацоўных вакол канкрэтных, штодзённых патрабаваньняў, уцягваньня ў выступленьні найбольш шырокіх мас пралетарыяту, а таксама беспрацоўных і галадаючых мас вёскі і абвастрэньня форм барацьбы (захват хлеба і аналу ў памешчыкаў і багатароў, адпор паліцыі і інш.).

У сувязі з паказаньнямі вышэй задачамі асабліва значэньне набывае арганізацыя шырокага масавага руху самаабароны і стварэньне яе кадраў—дружын самаабароны ў горадзе і вёсцы. ЦК яшчэ раз падкрэсьлівае вялізарнае значэньне ў сучаснай сітуацыі масавых палітычных стачак і арганізацыі барацьбы за вуліцу для адпору крывавому фашысцкаму тэрору і для падрыхтаваньня мас да рашаючых клясавых баёў. Барацьба супроць фашысцкага тэрору павінна быць у цэнтры ўвагі ўсіх партыйных арганізацый. Кожны факт сьмяротных прысудаў, карных экспэдыцый, забойстваў палітзьняволеных павінен сустрэць бурны пратэст мас у выглядзе палітычных стачак і масавых дэманстрацый. Партыя арганізуе масавы адпор нападам паліцыі і фашысцкіх баявых дружын, заклікае масы да вызваленьня арыштаваных, разгромленьня фашыстаў і арганізуе масавы адпор карным атрадам аж да масавага ўзброенага адпору.

3. Неадкладная рэалізацыя пастаноў V пленуму ЦК КПЗБ у справе ПАВАРОТУ ў кіраўніцтве нацыянальна-вызваленчай барацьбой. Нацыянальна-вызваленчая барацьба — гэта ядро ўсяго нашага руху. Ня ўлічваючы гэтага, мы не можам ні правільна ацэнаваць сутнасьць і характар сучаснай сітуацыі, ні правільна ўлічыць і ацэнаваць сілы, якія ідуць за нашымі лозунгамі, ні правільна ацэнаваць і ўлічыць сілы, якія ідуць супроць нас. Нацыянальна-вызваленчая барацьба — гэта ядро ўсяго нашага руху. Ня ўлічваючы гэтага, мы не можам

VII усебеларускі зьезд прафсаюзаў

Прафсаюзы БССР—у барацьбе за прамфінплян

З дакладу т. Камэнштэйна

Тав. **Камэнштэйн** у сваім дакладзе аб удзеле прафарганізацыі ў барацьбе за прамфінплян перш-на-перш ахарактарызаваў перамогі сацыялістычнай прамысловасьці, дасягнутыя на аснове бальшавіцкіх тэмпаў, на аснове ажыцьцяўленьня генэральнай лініі партыі і вялізарнага росту творчай актыўнасьці рабочых мас. На 1932 г. прыпадае амаль **40** проц. усёй валавой прадукцыі прамысловасьці БССР за чатыры гады, у той час, калі на 1928-29 г. прыходзіцца толькі **10** проц. Тэмпы сапраўды бальшавіцкія!

Якасьці работы—максымум увагі

Тав. **Камэнштэйн** адзначыў далей, што **выкананьне якасных паказальнікаў зьяўляецца адным з самых слабых зьвеньняў вытворчай работы.** Досыць паказаць, што ў той час, калі прадпрыемствы амаль кожную пяцідзёнку даюць весткі аб выкананьні колькасных паказальнікаў, дык аб ажыцьцяўленьні якасных паказальнікаў мы можам давеляцца толькі праз пару месяцаў, а то і далей. Задача поўнага выкананьня якасных паказальнікаў, паляпшэньня якасьці прадукцыі зьяўляецца цэнтральнай за ўсёй работе ў чацьвертым, заключным годзе пяцігодкі. Адставаньне ў гэтай галіне можна тлумачыць тым, што прафсаюзныя і гаспадарчыя арганізацыі дагэтуль мала ўвагі аддавалі барацьбе за якасьць работы.

Як прыкладаў сьведчыць аб дрэннай якасьці прадукцыі. Брак у ліцьці на мэталапрацоўчых заводах, брак у дэталях машын, дрэнная якасьць прадукцыі лёгкай прамысловасьці — усё гэта самым адмоўным чынам адбіваецца на рабочым спажываньні, на справе павялічэньня ўнутрыпрамысловых накапленьняў. Папяровая фабрыка «Прафінтэрн», напрыклад, дае прадукцыю вільготнасьцю ў 50 проц.; панчошная фабрыка імя Клары Цэткін замест прадугледжаных паводле пляну 10 проц. браку, за 9 месяцаў мела 27 проц., у сувязі з чым панесла страт звыш, чым на 500 тыс. руб. Менская абутковая фабрыка з-за дрэннай якасьці прадукцыі за 11 месяцаў 1931 году страціла ў тры разы больш, чым за ўвесь 1930 г. Віцебская абутковая фабрыка ў 1931 г. страціла з-за нізкай гатунковасьці абутку 150 тысяч руб.

Дрэнна стаіць справа з сабекоштам прадукцыі. Першыя месяцы 1932 г. далі павышэньне сабекошту супроць сярэднягадавога па радзе заводаў. На фабрыцы «Дняпро» сабекошт павысіўся супроць сярэднягадавога ў 1931 годзе на 27,9 проц., на фабрыцы імя Вароўскага — на 2,3 проц., на гомельскай абутковай фабрыцы—на 6,7 проц., на фабрыцы «Усход» — на 8,8 проц. Добрыя вынікі паказваюць гута «Пралетары» (Менск), якая зьнізіла сабекошт на 0,7 проц., менская абутковая — на 4 проц., але такіх прадпрыемстваў вельмі мала.

Справе павялічэньня ўнутрыпрамысловых накапленьняў, справе поўнага выкананьня якасных паказальнікаў—максымум увагі прафсаюзных арганізацый.

Узначаліць вытворчы энтузіязм мас

Дакладчык дае выразную характарыстыку сацыялістычных мэтадаў працы, якія шырока разгарнуліся на прадпрыемствах БССР. Вялізарны вытворчы энтузіязм рабочай класы выяўляецца ў высоўваньні, у нарадзжэньні ўсё новых і новых форм сацыялістычнай працы.

Масавы ўдым сацспаборніцтва і ўдарніцтва даў самыя вялікія вынікі ў выкананьні прамфінпляну. Арганізацыя «сквозных» брыгад, якія ахапілі ўвесь працэс вытворчасьці, дапамагла зьніжэньню неарганізаванасьці, непаладкаў у рабоце цэхаў.

Вялікую ролю адыграў **трамадзкі буксір** — адзін з мэтадаў дапамогі перадавых прадпрыемстваў адсталым.

Сустрэчны прамфінплян зьявіўся важнейшай формай удзелу шырокіх рабочых мас у апэрацыйным планаваньні вытворчасьці. Сустрэчны план даў значныя рэзультаты ў справе паскарэньня тэмпаў і паляпшэньня якасьці работы. Толькі па 15 улічаных прадпрыемствах рабочымі ўнесена звыш 2 тысяч рацыяналізатарскіх прапаноў; 20 проц. рабочых прымалі актыўны ўдзел у прапрацоўцы сустрэчных пляноў. Апошнія прапрацаваны на 360 вытворчых нарадах. Гэта па сутнасьці азначае, што рабочая класа ўсё бліжэй і бліжэй падыходзіць да справы непасроднага плянаваньня вытворчасьці, непасроднага кіраўніцтва прамысловасьцю. На прадпрыемствах «Пралетары» (Гомель), «Бальшавік», швейнай фабрыцы «Кастрычнік», ф-пы «Прафінтэрн» прапрацоўка сустрэчных пляноў адыграла вялікую ролю ў мабілізацыі ўнутраных рэсурсаў прадпрыемстваў. На заводзе «Бальшавік» у першым хромавым цэху прадукцыйнасьць працы паводле сустрэчнага павялічылася на 8,31 проц., у другім хромавым — на 6,82 проц., у апрэтурным цэху заводу «Пралетары» (Гомель) замест 200 клапанаў першая зьмена дала 220, другая—222, трэцяя—230.

Прыведзеныя лічбы паказваюць, што там, дзе фабрычна-заводзкія арганізацыі аддалі належную ўвагу рас працоўцы сустрэчных пляноў, гэта кампанія дала самыя станоўчыя вынікі.

Дакладчык падкрэсьлівае тыя недахопы, якія ёсьць у гэтай справе: слабы ўлік на якасныя паказальнікі, зусім невыстарчальны ўдзел ІТР у прапрацоўцы сустрэчных пляноў, невыстарчальная ўвязка паміж сустрэчнымі планамі і канкрэтнымі рабочымі прапановамі, адсутнасьць кантролю над уключэньнем сустрэчных пляноў у вытворчыя праграмы аб'яднаньня і г. д.

Далёка нездавальняюча стаіць справа з сустрэчным плянаваньнем на 1932 год. Той факт, што прамфінплян бягучага году ніяк канчаткова не распрановаи і што контрольных лічбы некалькі раз зьмяняліся і прайшлі праз рад варыянтаў, перашкодзіў—распрацоўцы сустрэчных.

Тав. **Камэнштэйн** падрабязна абмалёўвае работу вытворчых нарад і адзначае, што на сёньняшні дзень ніяк слаба ўкаранена практыка скліканьня нарад па прафэсіях. З 80 прадпрыемстваў толькі на 27 практыкавалася скліканьне вытворчых нарад па прафэсіях.

Пасьляховая работа вытворчых нарад ва многім залежыць ад выкананьня рабочых прапаноў і вынаходніцтваў. Справа рэалізацыі рацыяналізатарскіх прапаноў рабочых значна палепшылася за апошнія гады, аднак, мы ні ў якім разе ня можам задаволіцца дасягнутымі вынікамі. З боку прафарганізацый патрабуецца ўпартая барацьба за самую шырокую рэалізацыю каштоўных рабочых прапаноў, барацьба з бюракратычнымі адносінамі да рабочых-рацыяналізатараў і вынаходцаў. Мы часта бачым зусім недапушчальную цягаціну з ажыцьцяўленьнем прапаноў і вынаходак, якія даюць дзесяткі тысяч рублёў эканоміі ў год (вынаходка тав. Лёўшыца на мэблевай фабрыцы імя Халтурына, рацыяналізатарскае прапанова тав. **Роскіна** на Бабруйскім хлебакамбінаце, прапанова тов. Высоцкай на фабрыцы «Х Кастрычнік»). Скажэньні лініі партыі ў пытаньні стымуляваньня вытворчай ініцыятывы мас павінны сустрэць самы рашучы адпор.

Гаспадарча-разрахунковыя брыгады—вышэйшая форма сацспаборніцтва

Вышэйшая форма сацыялістычнага спаборніцтва — брыгады гаспадарчы разрахунак. Ён зьяўляецца сынтэзам сацспаборніцтва і масавага руху за гаспадарчы разрахунак. Укараненьне апошняга ў брыгадах зьяўляецца магутнай зброяй унутры прамысловых накапленьняў і выкананьня якасных паказальнікаў. Колькасьць гаспадарча-разрахунковых брыгад на прадпрыемствах БССР расьце с кожным днём. На заводах і фабрыках налічваецца каля 3-х тысяч брыгад, якія ахапляюць 25 проц. усіх рабочых. За мінулыя 8 месяцаў у гаспадарча - разрахунковых брыгадах накапіўся вельмі багаты вопыт барацьбы за выкананьне прамфінпляну. Паасобныя брыгады паказваюць сапраўдныя ўзоры ажыцьцяўленьня плянавых заданьняў. Брыгада т. **Станкевіча** (Гомсельмаш) выканала сваё заданьне ў студзені на 122,5 проц., узьняла прадукцыйнасьць працы на 17,5 проц., зьнізіла брак на 50 проц. і г. д. Брыгада т. **Соранта** на абутковай фабрыцы «Праца» замест 180 пар абутку ў дзень у парадку сустрэчнага выпускае 504 пары, дабілася ў студзені эканоміі 19 тыс. дацыэтраў окуры.

VI пленум УсеЦСПС, падкрэсьліўшы, што гаспадарча - разрахунковая брыгада зьяўляецца асноўнай формай арганізацыі працы на вытворчасьці, прызнаў якасное замацаваньне брыгад адзнэй з галоўных задач прафарганізацый.

У выніку невыстарчальнай увагі да работы брыгад, дрэннага кіраўніцтва імі з боку некаторых прафарганізацый, шаблёнасьці дагавароў, несваячасовага давядзеньня да брыгад вытворчых заданьняў, адсутнасьці апэрацыйнага ўліку многія гаспадарча-разрахунковыя брыгады ня выконваюць сваіх заданьняў. На адным прадпрыемстве ў Рэчыцы гаспадарча-разрахунковыя брыгады былі арганізаваны ніяк ў сьнежні мінулага году, але з таго часу ні разу на іх склікаліся нарады па пытаньні падвядзеньня вынікаў іх работы. На экстрактным заводзе імі Варашылава ў Рэчыцы з лістапада мінулага году ніяк ня быў падлічан эканамічны эфэкт работы брыгад, не правяраліся дагавары, ня выданы прэміі за добрую работу. Брыгады на заводзе былі арганізаваны адміністрацыяй па загаду дырэкцыі што ў корані паручае прынцып стварэньня гаспадарча-разрахунковых брыгад. На гомельскай фабрыцы «Праца» некаторыя брыгады дагэтуль ня маюць уліку работы і ня ведаюць, чаго яны дабіліся пасьля пераходу на гаспадарчы разрахунак.

Перабудова зарплаты

Тав. **Камэнштэйн** характарызуе **барацьбу прафарганізацый за рэалізацыю 6 умоў тав. Сталіна.** Важнейшым зьвяном у рабоце прафсаюзаў, у барацьбе за выкананьне і перавыкананьне прамфінпляну зьяўляецца перабудова зарплаты. Старое апартуністычнае кіраўніцтва УсеЦСПС правяло сваю палітыку ў галіне заработнай платы. Аплата працы рабочых вядучых галін прамысловасьці была ніжэй аплаты рабочых лёгкай прамысловасьці. У БССР у 1927-28 г. на першым месцы сталі швэйнікі, на другім — гарбары, на трэцім пячотачнікі, на чацьвертым—мэталісты. За апошнія два тры гады пасьля зьмены апартуністычнага кіраўніцтва УсеЦСПС становішча значна палепшылася. У 1931 г. на першым месцы ідуць вядучыя галіны прамысловасьці БССР. Прафсаюзы шмат што зрабілі ў адносінах ліквідацыі ўраўнілаўкі і ўкараненьня зьдельшчыны. Аднак, ніяк на сёньняшні дзень ураўнілаўка захавалася на радзе прадпрыемстваў, яна вызначаецца галоўным чынам у неадпаведнасьці аплаты кваліфікаваных і некваліфікаваных рабочых; акрамя выправільна пабудаванай, устаралай тарыфнай сеткі, ураўнілаўку нараджае дрэнная работа ТНБ і пачасоўшчына, якая ніяк моцна трымаецца на радзе нашых заводаў.

Прафарганізацыі павінны павесьці самую рашучую барацьбу са спробамі ажыцьцяўляць прэміяльную зьдельшчыну за кошт перавышэньня фонду зарплаты, са ўсякага роду скажэньнямі прынцыпаў прагрэсыўкі.

Баявыя задачы 1932 году

Той факт, што прамфінплян прамысловасьці БССР за студзень выкананы на 76,8 проц., за люты — на 83,4 проц., што тэмпы росту прадукцыйнасьці праны адстаюць ад росту заработнай платы, што якасныя паказальнікі па большасьці прадпрыемстваў ня выкананы, сьведчаць аб тым, што прафсаюзы яшчэ ня зрылі поўнасьцю, на аснове рэалізацыі 6 умоў тав. Сталіна, ажыцьцяўляць тыя апісаныя задачы, якія стаяць перад імі.

Максымальна, штодзенна кіраваць барацьбой за перабудову работы пановаму, стаць на чале вытворчай актыўнасьці рабочых мас, накіраванай на выкананьне прамфінпляну — цэнтральная асноўная задача прафсаюзаў.

На працягу 1932 г. прафэсыянальныя арганізацыі павінны правесьці сапраўды ўзорную работу па падрыхтоўцы да другой пяцігодкі. Гэту падрыхтоўку трэба праводзіць па дзьвёх лініях—па лініі выкананьня колькасных і якасных паказальнікаў прамфінпляну 1932 г. і па лініі ўдзелу ў плянаваньні другой пяцігодкі.

Пад кіраўніцтвам партыі,—у заключэньне гаворыць тав. **Камэнштэйн**,—на аснове яе генэральнай лініі, прафсаюзы павінны напружыць усе сілы, каб па-бальшавіцку мабілізаваць ініцыятыву, волю і энэргію мільённых мас на ажыцьцяўленьне гістарычных задач пабудовы сацыялізму.

Новы склад Цэнтральнага Савету прафсаюзаў БССР

Аляшкевіч, Адэінцоў, Адам, Андрэева (панчошная фабрыка), Андрэева (бабруйская фабрыка імя Дзяржынскага), Бэрэінг, Башмачнікаў, Беленькі, Блюмкін, Бэнзн, Батукоў, Барташун, Баскін, Баўтрук, Бэйнэнсон, Базойкі, Баяр, Варно, Вігдэргаўз, Войтаў, Уладзімерава, Вышнікаў, Віолевіч, Гікало, Галадзед, Гун, Грысевіч, Гусоў, Гарагляд, Гераўкер, Грандштэйн, Галавач, Галасон, Галдовіч, Гефэн, Гураў, Глейзэр, Герцовіч, Драбінскі, Давыдовіч, Дарожка (гомельская фабрыка «Камінтэрн»), Дарожка (Віцебская чыгунка), Дзэмідчык, Дзэорцава, Жаброўскі, Журомскі, Захаранка, Зьмітровіч, Іваноў, Іваноўская, Калнін, Кавалёў, Камэнштэйн, Клімковіч, Кацнэльсон, Казімірчык, Кудман, Колін, Куковіч, Ковенскі, Каттярскі, Кац, Кантаровіч, Кавалёў П., Кандрацьцева, Каверда, Лашкевіч, Лазарава, Левін, Літвінскі, Лукашэвіч, Манжалей, Мардуховіч, Малярэвіч, Майзэлес, Міруц, Маркоўскі, Марусевіч, Макарэвіч, Нікіценка, Плятнёў, Пракоф'ева, Платун, Плоткін, Плешакоў, Піліпенок, Пачакала, Пускалева, Позьняк, Панкевіч, Плячук, Падвойская, Рыжоў, Рысскін, Рохкін, Разумаў, Рэзьнік С. Д., Сталяроў, Саламонаў, Сідарава, Саладоўнікава, Сікорскі, Сыуратовіч, Талочка, Турпай, Таміла, Тацьянок, Таніповіч, Ушакова, Фацеева, Філатаў, Халфін, Хаскін, Хвалдовіч, Цьвяткова, Шаранговіч, Штэйман, Шулькін, Шацілка, Эйдэльман, Юшкевіч, Яжкоўскі.

Кандыдаты ў члены ЦСПСБ

Азарыкевіч, Аніс, Бахцін, Буйніцкая, Барысаў, Вашчылка, Гурэцкі, Гольдбэрг, Гарынг, Гершман, Дамброўскі, Давыдовіч, Даўбор, Дарожкіна, Ермаловіч, Зорын, Каждан, Кайкоў, Красны, Карповіч, Лунгін, Манько, Мархашоў, Мандрык, Плінур, Пархоменка, Пяруцкі, Рыклін, Радзейка, Стэпіна, Сяргеева, Талівача, Хвалько, Юдзевіч, Юдзін Цімошкін, Штайнгольц, Эзрын, Якабсон.

Склад рэвізійнай камісіі ЦСПСБ

Альтшулер, Афэнгейм, Вісгардзіцкая, Голік, Кудраеў, Марозаў, Сапожнікаў, Туфэльд, Эльпэрын.

Дэлегаты, выбраныя на IX усесаюзны зьезд прафсаюзаў

З ПАСТАНОЎЧЫМ ГОЛАСАМ: Жаброўскі, Рыжоў, Баярскі, Кавалёў, Шулькін, Беленькі, Разумаў, Бэрэінг, Халфін, Кантаровіч, Карнацоў, Дзергачоў, Лунгін, Фрэнклех, Дарокін В. І., Гефэн.

З ДАРАДЧЫМ ГОЛАСАМ: Плешакоў, Клімковіч, Камэнштэйн, Башмачнікаў, Малярэвіч, Драбінкі, Штайман, Баскін.

Склад прэзыдыуму ЦСПСБ

ЧЛЕНЫ: Жаброўскі, Рыжоў, Кавалёў, Плешакоў, Левін, Клімковіч, Адам, Башмачнікоў, Гераўкер, Шулькін, Баскін, Міруц, Плятнёў, Бэрэінг, Пракоф'ева, Гефэн, Карнацоў.

КАНДЫДАТЫ Ў ЧЛЕНЫ: Юшкевіч, Манжалей, Майзэльс, Гарагляд, Штэйман, Войтаў.

Сакратарыят ЦСПСБ

Рыжоў, Кавалёў, Плешакоў, Левін, Клімковіч.

Размяркаваньне абавязкаў

РЫЖОЎ — старшыня ЦСПСБ,

КАВАЛЁЎ — адказны сакратар,

ПЛЕШАКОЎ — загадчык арганінструктарскім сэктарам,

ЛЕВІН — загадчык сэктарам вытворчасьці і плянаваньня,

АДАМ — загадчык сэктарам зарплаты і нармаваньня,

КЛІМКОВІЧ — загадчык культсэктарам,

БАШМАЧНІКАЎ — загадчык масавым сэктарам,

КОВЕНСКІ — загадчык сэктарам прам тэхнаправу,

КАЦ — загадчык сэктарам прафкадраў,

РОХКІН — загадчык сацыяльна-бытавым сэктарам,

ГЕРАЎКЕР — загадчык сэктарам рабочага забесьпячэньня,

АНІС — загадчык фінсэктарам.

Чыгуначны транспарт

Без чаргі грузіць і разгружаць пасеўныя грузы

Не затрымліваць ніводнай гадзіны

Зараз па БССР шырока разгарнулася падрыхтоўка да веснавой пасеўкампаніі. У бягучым годзе праграма сяўбы значна вышэй леташняй. На аснове рэалізацыі гэтага пляну будзе забясьпечана далейшае арганізацыйна гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў, завяршэньне ў асноўным калектывізацыі ў 1932-33 годзе. Выкананьне гэтых задач патрабуе ад усіх партыйных, савецкіх і грамадзкіх арганізацый значнага ўзмацненьня ўвагі да пытаньня падрыхтоўкі да сяўбы.

Зусім відавочна, што транспарт адыгрывае важнейшую ролю ў выкананьні посьпеху пасеўнай кампаніі. Ад работы транспарту ў значнай ступені будзе залежаць выкананьне пляну сяўбы. Баявымі задачамі транспарту зьяўляюцца: без чаргі прасоўваць пасеўныя грузы — сельска-гаспадарчыя машыны, утаеньне, пасеньне, гаручае для трактараў і г. д.

Большасьць чыгунак яшчэ ня ўключыліся ў падрыхтоўку да пасеўнай кампаніі. Толькі ў апошнія дні **Жлобінскі, Віцебскі, Аршанскі і Магілеўскі** вузлы пачалі работу ў гэтым напрамку. Арганізацыя кантрольных пастоў па праверцы нагрузкі і адпраўкі пасеўных грузаў зьяўляецца надзвычайна каштоўным мерапрыемствам, якое павінна быць пашырана па ўсіх вузлах БССР.

Чыгуначныя вузлы паводле загаду НКШЗ абавязаны завесьці асобны ўлік пасеўных грузаў і забясьпечыць унечарговае прасоўваньне іх.

Факты, якія падаюцца ў карэспандэнцыі з Гомеля паказваюць, што на станцыях яшчэ не забясьпечана бесперабойнае прасоўваньне пасеўгрузаў. Зусім недапушчальным зьяўляецца тое, што да апошняга часу кліэнтура (зямельныя органы) не далі заявак на патрэбны лік перавозак пасеўных грузаў. Чыгунка павінна ў бліжэйшыя дні атрымаць ад кліэнтуры выразныя планы перавозак.

На аснове масавага рабочага кантролю за прасоўваньнем пасеўных грузаў, сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва забясьпечым прыкладнае выкананьне задач, якія стаяць перад транспартам у бягучую веснавую кампанію.

Трыццаць вагонаў насенгрузаў чакаюць нарадаў Саюзхлеба

ГОМЕЛЬ. (Наш кар.).

На 5-м эксплёатацыйным раёне Заходніх чыгунак (Гомель) дыроктыва аб прасоўваньні без чаргі пасеўных грузаў была дана станцыям 9 лютага. Але ў апараце раёну і па сёньняшні дзень адсутнічае ўлік, як ажыцьцяўляецца гэта дыроктыва на мясцох, дзе і па якой прычыне затрымліваецца прасоўваньне пасеўных грузаў на прамежных станцыях і г. д. У начальніка аддзелу эксплёатацыі 5 раёну тав. **Кіцько** няма пляну, паводле якога было-б вызначана, куды і адкуль павінны перавозіцца пасеўныя грузы. Кіраўнік аддзелу эксплёатацыі па арганізацыі руху тав. **Буланы** ня прыняў захадаў, каб арганізаваць улік прасоўваньня паасобных пасеўных грузаў па кожнай станцыі.

З боку кліэнтуры таксама нагляданцца агідныя адносіны да перавозкі пасеўных грузаў і с.-г. інвэнтару ў плянавым парадку. Завод **Гомсельмаш** па сакавік даў транспарту заяўку перавезьці 535 сельска-гаспадарчых машын. Для гэтага ў першай дэкадзе сакавіка патрэбна было 170 вагонаў, а ў другой — 173, фактычна-ж у першай дэкадзе было адгружана толькі 70 вагонаў. Недагруз 100 вагонаў—па віне Гомсельмашу. На станцыі **Бондараўка** ляжаць 13 вагонаў розных пасеўных культур, якія не адгружаюцца з прычыны адсутнасьці нарадаў з паказаньнем, куды везьці гэты груз. Са станцыі **Крукова** трэба перавезьці 30 вагонаў розных пасенных грузаў. Аддзяленьні Саюзхлеба на гэтых станцыях ня прымаюць ніякіх захадаў, каб своечасова пераляпуць гэтыя грузы, а чакаюць пакуль вясна ўступіць у поўны разгар і тады... будуць абвінавачваць чыгуначны транспарт. На станцыі **Доч** ляжаць 22 вагоны насенных грузаў. Да гэтага часу адгружана толькі 8 вагонаў. Рэшта 14 вагонаў затрымліваюцца па прычыне нягібкасьці апарату станцыі. Паасобныя арганізацыі даюць зусім нераальныя заяўкі. Напрыклад, начальніку станцыі **Гародня** аддзяленьне Саюзхлеба дало заяўку перавезьці 8 вагонаў пасеўных грузаў, а фактычна ўжо на сёньняшні дзень адгружана 11 вагонаў. Такіх прыкладаў можна прывесьці шмат.

Гэтыя факты з усёй відавочнасьцю паказваюць, што плянавасьці па гэтым важнейшым вучастку работы няма. Пасеўныя грузы перавозяцца ў парадку самацёку і без належнага грамадзкага кантролю. У далёкім такія павольныя тэмпы зусім недапушчальны. Перавозка пасеўных грузаў павінна быць узята пад пільны пралетарскі кантроль. Троба зараз-жа на ўсіх станцыях і пагрузачна-разгрузачных пунктах стварыць з лепшых ударнікаў-чыгуначнікаў пасты па прасоўваньні пасеўных грузаў.

Чыгуначныя арганізацыі БССР павінны добра памятаць, што ад своечасовай перакідкі сельска-гаспадарчых машын і пасеўных грузаў будзе залежыць пасьпяховае выкананьне пляну сяўбы ў чацьвертым, заключным годзе пяцігодкі.

Н. Гафт.

Тры вагоны фасфарытнай мукі—пад адкосам

Яшчэ 9-га лютага ў адрас лагойскага райкалгассаюзу прыбылі на ст. Менск тры вагоны фасфарытнай мукі. Таварная станцыя не паклапацілася своечасова паведаміць аб гэтым заказчыка. Груз быў звален пад адкос. Толькі 8 сакавіка таварная станцыя ўспомніла і паведаміла НКЗ аб прыбыцьці грузу. Лагойскі райкалгассаюз 13 сакавіка прыслаў на станцыю 70 фурманак. Але з прычыны таго, што груз прыбыў наложаным плацяжом і трэба было заплаціць за яго 252 рублі, адміністрацыя ня выдала грузу фурманам, якія прыехалі бяз грошай. Звароты брыгадзіра ў Калгасцэнтр, Бел. Аддзяленьне мінугнаеньня ні да чаго не прывялі. 70 фурманак прымушаны былі вярнуцца назад за 50 клм. бяз грузу.

Галавацяпы з Менскай таварнай станцыі і лагойскага райкалгассаюзу павінны быць прыцягнуты да адказнасьці.

ГНЕЎКА.

В. ГАНТМАН

Да праверкі партыйна-масавай работы ў цэху і брыгадзе*)

ЦК КП(б)Б прыняў настанову аб правядзеньні **масавай праверкі** станові шча нізавых партыйных зьвеньняў, перабудовы партыйнай работы, правядзеньня шырокага агляду з мэтай умацаваньня тэмпаў перабудовы партыйнай работы, з мэтай умацаваньня работы нізавога партыйнага зьвяна.

Мы маем ня мала прыкладаў таго, што толькі там, дзе ўмацавана нізавое партыйнае зьвяно, толькі на гэтым прадпрыемстве, дзе правільна перабудавана партыйная работа на аснове 6 умоў тав. Сталіна, дзе створаны партыйныя групы і ня толькі створаны, а дзе партыйная група своечасова адклікаецца на ўсе запатрабаваньні вытворчасьці, на ўсе запытаньні рабочае масы, — там выкананьне прамфінпляну ідзе добра. Там ёсьць выкананьне і перавыкананьне прамфінпляну. Гэта цалкам адносіцца і да саўгасаў, МТС і калгасаў. Там, дзе партыйная работа перабудавана, дзе ў брыгадах створаны і працуюць партыйныя групы, ёсьць партарганізатары ў гэтых саўгасах, МТС і калгасах, бязумоўна ёсьць добрыя вытворчыя паказальнікі. Там, дзе работа перабудавана з пункту погляду перанясеньня цэнтру ня жару ўсёй партыйна - масавай работы ў нізавыя зьвеньні, у вытворчыя брыгады, — там справа з выкананьнем вытворчых плянаў, справа з выкананьнем і правядзеньнем усіх палітычных і гаспадарчых задач, справа выхаваньня шырокіх рабочых і калгасных мас бязумоўна абстаіць добра. Таму мы павінны скарыстаць у максымальнай меры масавы агляд, масавую праверку становішча нізавога партыйнага зьвяна ў мэтах стварэньня яго там, дзе яго няма і ў мэтах узмацненьня яго работы, правільнага накіраваньня і павышэньня якасьці работы нізавога партыйнага зьвяна.

На цэлым радзе прадпрыемстваў настанова ЦК УсеКП(б) ад 21-га сакавіка 1931 г. выконваецца фармальна, а не па сутнасьці.

Іншая справа на прадпрыемствах, як Гомсельмаш, «Бальшавік», завод імя Ланцушкага ў Гомелі і многіх іншых, дзе партгрупа — нізавое партыйнае зьвяно сапраўды зьяўляецца жывым, дзейным зьвяном, там прамфінплян выконваўся і перавыконваецца. Таксама гэта цалкам адносіцца і да раду нашых саўгасаў і калгасаў.

Мы павінны правесьці масавую праверку над кутом погляду сапраўднай перабудовы партработы, дабіцца таго, каб нізавое партыйнае зьвяно стала жывым дзейным зьвяном, вядучым за сабою масы рабочых, усю брыгаду ў галіне выкананьня вытворчага заданьня як у колькасных, так і якасных паказальніках, тым зьвяном, якое жыва адгукваецца на ўсе запатрабаваньні і запытаньні ўсёй брыгады, усёй рабочай масы.

Праверка нізавога партыйнага зьвяна на прадпрыемствах, саўгасах МТС і калгасах зьяўляецца ў першую чаргу праверкай таго, як кожнае партыйнае зьвяно ў цэлым і кожны камуніст паасобку змагаецца за ажыцьцяўленьне генэральнай лініі партыі, вядзе барацьбу з ухіламі ад лініі партыі на два фронты і прымірэнцтвам да ўхілаў як у тэорыі, так і ў практыцы сваёй штодзённай работы ля варштату, на паравозе, за трактарам. на жывёлагадоўчай фэрме, у калгаснай брыгадзе, на розных вучастках сацыялістычнага будаўніцтва.

Мы павінны правесьці гэты шырокі агляд перабудовы партыйнай работы на прадпрыемствах, у саўгасах, МТС, калгасах пад пунктам погляду таго, наколькі камуніст данай партыйнай групы адыгрывае сваю авангардную ролю, ці зьяўляецца камуністы данай групы ўсе пэгалоўна сапраўднымі ўдарнікамі, ці прымае партыйная група актыўны ўдзел у арганізацыі сацыялістычнага спаборніцтва. Трэба праверыць, наколькі даная партгрупа выконвае сваю арганізуючую і кіруючую ролю, наколькі партыйная група падхапляе ініцыятыву лепшых перадавых рабочых - ударнікаў з тым, каб гэту ініцыятыву прасунуць і перанесьці на ўсе іншыя вытворчыя вучасткі работы дапага прадпрыемства, саўгасу і калгасу, гэта значыць на сутнасьці наколькі ўся партыйная група ў цэлым і кожны камуніст паасобку зьяўляецца кіраўніком, арганізатарам, які дае прыклад, лепшыя ўзоры ўдарнай работы на любым вучастку нашай прамысловасьці і с. - г. вытворчасьці.

Таксама неабходна праверыць, наколькі партгрупа разгарнула партыйна - масавую работу, выхаваўчую работу, наколькі яна па-сапраўднаму, па -бальшавіцку выконвае задачы, пастаўленыя партыяй адносна перавыхаваньня ўсёй масы рабочых і ў першую чаргу маладых новых рабочых, якія нядаўна ўліліся ў вытворчасьць і часта прыносяць з сабою адсталыя дробна - буржуазныя настроі і перажыткі. Наколькі партыйная група разгарнула масава - палітычную работу, наколькі своечасова даводзяцца ўсе пастановы партыі да шырокіх рабочых і калгасных мас, наколькі правільна іх папуляризуе, увязваючы агульна-палітычныя задачы з канкрэтнымі задачамі, якія стаяць перад тэй ці іншай паасобнай групай рабочых, калгаснікаў, на тым ці іншым вучастку нашага сацыялістычнага будаўніцтва.

ЦК партыі ў сваёй пастанове адносна ролі і ўдзелу друку ў правядзеньні гэтай кампаніі запісаў наступны пункт: «Прапанаваць рэдакцыям цэнтральных і рабочых газэт, пікетыраванак, пасьцепгазэт, зараз-жа арганізаваць шырокі агляд работы нізавога партыйнага зьвяна на вытворчасьці і вопыт работы шырока асьвятляць у друку, паклаўшы гэтым пачатак сыстэматычнага штодзённага асьвятленьня ў далёкіх работах нізавога партзьвяна. З мэтай чаго прыдзецца газэтам зараз-жа арганізаваць свае пасты па прадпрыемствах, у цэхах, саўгасах» і г. д.

Рось адзін з пунктаў гэтай пастановы, які абавязвае ўсе газэты прыняць актыўны ўдзел і ня толькі ўдзел. Мы патрабуем, каб газэты аказалі самую актыўную дапамогу партыйным арганізацыям у правядзеньні масавага агляду. праверкі становішча нізавых партыйных зьвеньняў і перабудовы партыйнай работы. Гэта, такім чынам, павінна паклясьці пачатак таго, каб у далёкім сыстэматычна асьвятляць гэта пытаньне.

Чаму так ЦК настаяваў? Таму, што не гледзячы на абліпаньне, ня гледзячы на пастановы, якія ёсьць пакоп гэтага, нашы газэты (гэта адносіцца і да цэнтральных гарадзкіх і раённых газэт) пытаньнем становішча партыйна - масавай работы, перабудовы партыйнай работы, а асабліва становішча нізавога партыйнага зьвяна адлаюць вельмі мала ўвагі. Рэдка сустракаем газэту з заметкамі, высьвятляючымі добры вопыт работы. А ці ёсьць ён? Ён ёсьць на радзе прадпрыемстваў, у рабоце партыйных арганізацый бязумоўна ёсьць, але не знаходзіць адлюстраваньня ў друку.

Праверка будзе праводзіцца шляхам стварэньня праверачных і самаправерачных брыгад; з партактыву, у кожнай партыйнай ячэйцы, у кожнай цэхавай і зьменнай ячэйцы будуць створаны брыгады, якія будуць правяраць становішча нізавога партыйнага зьвяна, як яны працуюць, як створаны трыкутнікі, якую партгрупа вядзе партыйна - масавую работу. як стаіць справа з пагалоўным уцягненьнем усіх камуністаў па ўдарніцтва, як працуе зараз брыгада ў цэлым над кіраўніцтвам ячэйкі на падставе зьменна-сустрэчнага плянаваньня і гаспадарчага разрахунку. Неабходна рэдакцыям усіх газэт уключыцца ў гэтыя самаправерачныя брыгады праз партработнікаў з тым, каб матар'ялы выпікаў агляду становішча партыйных арганізацый і перабудовы партыйнай работы. Гэта, такім чынам, павінна паклясьці пачатак таго, каб у далёкім сыстэматычна асьвятляць гэта пытаньне.

Чаму так ЦК настаяваў? Таму, што не гледзячы на абліпаньне, ня гледзячы на пастановы, якія ёсьць пакоп гэтага, нашы газэты (гэта адносіцца і да цэнтральных гарадзкіх і раённых газэт) пытаньнем становішча партыйна - масавай работы, перабудовы партыйнай работы, а асабліва становішча нізавога партыйнага зьвяна адлаюць вельмі мала ўвагі. Рэдка сустракаем газэту з заметкамі, высьвятляючымі добры вопыт работы. А ці ёсьць ён? Ён ёсьць на радзе прадпрыемстваў, у рабоце партыйных арганізацый безумоўна ёсьць, але не знаходзіць адлюстраваньня ў друку.

Праверка будзе праводзіцца шляхам стварэньня праверачных і самаправерачных брыгад; з партактыву, у кожнай партыйнай ячэйцы, у кожнай цэхавай і зьменнай ячэйцы будуць створаны брыгады, якія будуць правяраць становішча нізавога партыйнага зьвяна, як яны працуюць, як створаны трыкутнікі, якую партгрупа вядзе партыйна - масавую работу. як стаіць справа з пагалоўным уцягненьнем усіх камуністаў па ўдарніцтва, як працуе зараз брыгада ў цэлым над кіраўніцтвам ячэйкі на падставе зьменна-сустрэчнага плянаваньня і гаспадарчага разрахунку. Неабходна рэдакцыям усіх газэт уключыцца ў гэтыя самаправерачныя брыгады праз партработнікаў з тым, каб матар'ялы выпікаў агляду становішча партыйных арганізацый і перабудовы партыйнай работы. А ці ёсьць ён? Ён ёсьць на радзе прадпрыемстваў, у рабоце партыйных арганізацый безумоўна ёсьць, але не знаходзіць адлюстраваньня ў друку.

Праверка будзе праводзіцца шляхам стварэньня праверачных і самаправерачных брыгад; з партактыву, у кожнай партыйнай ячэйцы, у кожнай цэхавай і зьменнай ячэйцы будуць створаны брыгады, якія будуць правяраць становішча нізавога партыйнага зьвяна, як яны працуюць, як створаны трыкутнікі, якую партгрупа вядзе партыйна - масавую работу. як стаіць справа з пагалоўным уцягненьнем усіх камуністаў па ўдарніцтва, як працуе зараз брыгада ў цэлым над кіраўніцтвам ячэйкі на падставе зьменна-сустрэчнага плянаваньня і гаспадарчага разрахунку. Неабходна рэдакцыям усіх газэт уключыцца ў гэтыя самаправерачныя брыгады праз партработнікаў з тым, каб матар'ялы выпікаў агляду становішча партыйных арганізацый і перабудовы партыйнай работы. А ці ёсьць ён? Ён ёсьць на радзе прадпрыемстваў, у рабо

Дэлегаты 19-ай арміі адхілілі японскія патрабаваньні

Генэрал Цзян-Гуан-най пакінуў Шанхай і выехаў на фронт

ШАНХАЙ, 23. Вялікую сенсацыю выклікала вестка аб тым, што галоўны ваенны дэлегат на «мірнай» канфэрэнцыі генэрал 19-й арміі Цзянь Гуан-най 22-га сакавіка ўвечары пакінуў Шанхай. Шанхайскае прадстаўніцтва 19-й арміі выпусьціла бюлетэнь, у якім зазначаецца, што Цзянь Гуан-най выканаў свае афіцыяльныя абавязкі, якія яму былі даручаны ў Шанхаі і выехаў на фронт і ня будзе больш прымаць удзелу ў перагаворах. Другі генэрал 19-й арміі Дай-цзы, які знаходзіцца ў Шанхаі і якога вашкінскі ўрад меў намер назначыць галоўным ваенным дэлегатам, в прычыны хваробы ўходзіць у шпіталь. У кітайскіх колах зазначаюць, што ад'езд Цзян Гуан-ная выклікан адмоваю камандаваньня 19-й арміі падтрымаць пазыцыі нанкінскага ўраду, які згадзіўся прыняць ультыматум японскіх патрабаваньні, зьмест якіх покуль застаецца невядомым. Ніякіх афіцыяльных прычын адмовы Цзян Гуан-ная прымаць удзел у перагаворах не паказана. Калі нанкінскі ўрад даведаўся аб ад'езьдзе Цзян Гуан-ная, ён назначыў галоўным ваенным дэлегатам Дай-цзы. Адзак, паводле агульнай думкі Дай-цзы адмовіцца прыняць гэта назначэньне.

Новых намесьнікаў нанкінскі ўрад дагэтуль не называе. Магчыма, што мірныя перагаворы будуць адкладзены. У кітайскіх колах зусім адкрыта выказваюць незадаваленьне з прычыны прыняцьця нанкінскім урадам умоў, паводле якіх кітайскія войскі застаюцца на цэнтральных пазыцыях у той час, як японскім дазволена адыйсьці ў бліжэйшыя пункты ля сатыньэнта. Прыняцьце гэтых умоў кітайцы расцэньваюць, як дазвол японцам заставацца ва Усуне, дзе згодна кітайскіх паведамленьняў, японцы сьпешна ўмацоўваюцца і стараюць новыя лініі абароны. З мэтай паслабіць абураную грамадзкую думку, кітайскія чыноўнікі зазначаюць, што да гэтага часу перагаворы не пасунуліся наперад, бо ня ўстаноўлен час поўнага завяршэньня эвакуацыі японскіх войск і іншыя важныя дэталі. (ТАСС).

Налёты японскіх самалётаў на Ханчжоу ня спыняюцца

ШАНХАЙ. 21 сакавіка японскія самалёты зноў зьявіліся над Ханчжоу (галоўны горад правінцыі Чжэцзян). **Самалёты адкрылі кулямётны агонь па чыгуначнай станцыі, параніўшы адну жанчыну.** Пазьней самалёты зрабілі некалькі палётаў над Цзяньцзяо, Цзакоў і іншымі прыгарадамі Ханчжоу.

* * *

ШАНХАЙ, 22. Амэрыканскі місіянэр у Сучжоу паслаў тэлеграму Лізе нацый, патрабуючы прыняцьця крокаў да спыненьня палётаў японскіх самалётаў над Сучжоу. У тэлеграме ўказваецца, што палёты робіцца штодзенна на працягу апошніх трох тыдняў.

Японскія пляны ў Шанхаі

БЭРЛІН, 22. Паводле паведамленьня такійскага карэспандэнта агэнцтва «Вольфа», **японскі адмірал Або**, які вярнуўся са сваёй інспэкцыйнай паездкі, заявіў, што «як для кітайцаў, так і для чужаземцаў лепш за ўсё будзе, калі раён Шанхаю будзе ператворан у «зону бясьпечнасьці, у межах якой кожны можа дзейнічаць зусім бясьперашкодна». Паводле слоў Або такое вырашэньне пытаньня на толькі ў інтарэсах Японіі, але і ў інтарэсах іншых краін. «Кітай і чужаземцы, — гаворыць далей Або, — тым самым даведаюцца аб сапраўдных намерах Японіі. Шанхай стане гандлёвым цэнтрам для ўсіх народаў сьвету».

На здымку: Уверсе—адзін з кварталаў Шанхаю, разбураны японскай артылерыяй і паветранай бамбардыроўкай; Унізе—кітайскія салдаты здбіваюць атаку японскіх войск

Члены камісіі Лігі пад экскортам японскіх салдат

ШАНХАЙ, 22. Камісія Лігі нацый, паведаўшы спустошаныя тэрыторыі, выказала думку, што **японска-кітайскія ваенныя дзеяньні ў Чапэі, Цзяньсане, Усуне могуць быць параўнаны толькі з тымі, якія адбываліся на заходнім фронце ў часе імпэрыялістычнай вайны.** Згодна паведамленьня на членаў камісіі зрабілі «вялікае ўражаньне» спустошаныя тэрыторыі, якія сьведчылі аб жорстких баёх. Між іншым усе «надарожкі» камісіі арганізаваны японцамі. **Частка членаў камісіі экскартуецца японскімі салдатамі** (ТАСС).

У часе штурмавой дэкады дабіцца перамогі на фінансавым фронце

Да 1-га красавіка поўнасьцю выканаць фінплян першага кварталу

Да ўсіх ударнікаў фінансавага фронту, да ўсёй савецкай грамадзкасьці БССР

Ажыцьцяўленьне гістарычных задач пяцігодкі ставіць перад народна-гаспадарчым планам і яго асноўнай часткай —фінансавым планам чацьвэртага, заключнага году адказнейшую задачу стварэньня матар'яльнай базы будаўніцтва сацыялізму.

У сувязі з гэтым пасьпяховае выкананьне пляну мабілізацыі сродкаў першага кварталу набывае выключнае значэньне. Яно ў значнай ступені прадвызначае поўнае выкананьне ўсяго фінпляну 1932 г.

Спабясьць арганізацыйна-масавай работы, незьмітарчальнае ўцягненьне шырокіх рабочых, калгасных мас і ўдарнікаў фінансавага фронту ў барацьбу за фінплян у радзе раёнаў паставіла пад пагрозу ажыцьцяўленьне фінансавай праграмы першага кварталу.

Для забесьпячэньня ўдарных бальшавіцкіх тэмпаў фінансавай работы ЦК КП(б)Б абвясьціў з 21-га сакавіка дэкаду штурму па мабілізацыі адставаньня ў мабілізацыі сродкаў.

Рабочыя і калгасьнікі, станавецеся ў перадавыя палёны барацьбітоў за фінплян, надайце справе мабілізацыі сродкаў ударныя тэмпы!

Ударнікі фінансавага фронту! Забясьпечце сапраўдны ўдым сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва ў барацьбе за пастуленьне да першага красавіка культбору на вёсцы, за поўнае выкананьне заданьняў па добраахвотных плацяжох — пазыцыі «Трэці рашаючы», укладах у ашчаднасы, пазыкаапленьні, акцыях Трактарацэнтру.

Рашучы ўдар па кулаку! Прымусім яго выканаць фінансавыя абавязацельствы перад пралетарскай дзяржавай.

Наркамфін БССР заклікае камсамол —шэфа ашчаднас, савецкія, прафэсіянальныя арганізацыі і ўсіх ударнікаў фінансавага фронту стаць на чале барацьбы за поўнае выкананьне пляну мабілізацыі сродкаў. НКФ БССР зварачаецца да пралетарскай грамадзкасьці Барысаўскага, Талачынскага, Гарадоцкага, Горацкага, Шклоўскага, Жлобінскага, Веткаўскага, Капыльскага, Лоеўскага, Уваравіцкага, Старадарожскага і Расонскага раёнаў, якія адстаюць, дапамагчы фінансаваму апарату выцягнуць гэтыя раёны з пасасы ганебнага адставаньня.

Ператворым дэкаду штурму ў дэкаду сапраўднага бальшавіцкага змаганьня за фінплян! Выкананьнем пляну першага кварталу, забясьпечым бесьперабойнае фінансаваньне весьнавой пасеўнай кампаніі, прамысловага і культурнага будаўніцтва.

Народны камісар фінансаў БССР ХАЦКЕВІЧ.

Ветка—у апошніх радох

Выкананьне пляну мабілізацыі сродкаў першага кварталу па **Веткаўскім раёне** праходзіць дрэнна. Абавязковыя плацяжы паступаюць вельмі марудна. Культбор па раёне спагнаны ня больш як на 10 проц. У Мар'інскім сельсавеце платнікі культбору атрымалі паведамленьні толькі 10-12 сакавіка. На 15-га сакавіка культбор па гэтым сельсавеце паступіў толькі ў суме 800 руб. у той час, як налічана 11.906 руб.

Для дапамогі сельсаветам у праведзеньні мабілізацыі сродкаў райфінсавет мабілізаваў 30 актывістаў, якія ляцяць 16-га сакавіка навінны былі выехаць на месцы. З вызначаных таварышоў выехала толькі 10, а рэшта паваг по зьяніліся ў райфа для інструктажу. Для гэтага часу прафсаюзы на прымаюць ніякага ўдзелу ў мабілізацыі сродкаў. Нават саюз фінансавабанкаўскіх работнікаў не праявіў належнай увагі да гэтай справы.

СЯРГЕЙЧЫК.

Фабрыка „1-га мая" дабілася значных посьпехаў

Грамадзкія арганізацыі **кушнернай фабрыкі імя Першага мая** дабіліся значных посьпехаў у справе выкананьня фінпляну. Па ўсіх істужках і цэхах фабрыкі быў абвешчан конкурс на лепшае правядзеньне фінансавага паходу і вызначаны прэміі для ўдарнікаў фінансавага фронту. На 10 сакавіка плян па ўкладах перавыкапан на 25 проц. — замест 4000 руб. сабрана 5000 р. Калектыўным страхаваньнем ахоплена зараз 85 проц. усіх рабочых фабрыкі. Запазычанасьць па пазыцы «Трэці рашаючы» за сакавік поўнасьцю ліквідавана да 15-га сакавіка.

Рабочы калектыў фабрыкі заклікае ўсе адстаючыя калектывы падцягнуцца, каб поўнасьцю выканаць фінплян.

Брыгада: Цырыкіна, Шусьцяровіч, Школьнік, Сандлер, Каждан.

Пераключыць усю работу на бальшавіцкія тэмпы

Усім райземаддзелам, калгасаюзам і дырэктарам МТС

Невыкананьне пляну мабілізацыі сродкаў па калгасах, асабліва па ўступных мэтавых узносах, акцыях Трактарацэнтру і інкубатарацэнтру стаіць пад пагрозу фінансаваньне мерапрыемстваў весьнавой сяўбы, будаўніцтва МТС і інкубатарных станцый.

Абвяшчаем апошнюю дзесяцідзеўку першага кварталу дэкадай ударнай мабілізацыі добраахвотных і абавязковых плацяжоў. Катэгарычна абавязваем райземаддзелы, калгасаюзы, МТС, а таксама ўсіх работнікаў камандыраваных Наркамземам і Калгасцэнтрам на весьнавую сяўбу, паставіць мабілізацыю сродкаў у калгасах у цэнтры мерапрыемстваў па весьнавой кампаніі, мабілізаваць ударную калгасную грамадзкасьць на правядзеньне дэкадніка штурму, пераключыўшы ўсю работу на бальшавіцкія тэмпы.

Наркамзем РАЧЫЦКІ.
Калгасцэнтр СТРЭЛЕ.
Беларадзяленьне Трактарацэнтру КАРШАКЕВІЧ.

15-ю ГАДАВІНУ КАСТРЫЧНІКА СУСТРЭНЕМ МАГНІТАБУДАМІ МАСТАЦТВА

Конкурс-спаборніцтв на лепшы пралетарскі твор

1932 год зьяўляецца годам вялікіх **ГІСТАРЫЧНЫХ ДАТ і НОВЫХ ПЕРАМОГ САЦЫЯЛІЗМУ.** У гэтым годзе мы **ЗАВЯРШАЕМ** за чатыры гады **першую бальшавіцкую пяцігодку.** У чацьвертым квартале — у прадпаўдзе месяцы заключнага году савецкая краіна будзе сьвяткаваць **15-Ю ГАДАВІНУ Кастрычніцкай рэвалюцыі.**

Гэтыя два факты, гэтыя дзьве даты маюць вялізарнае **сусьветна-гістарычнае** значэньне. І зусім зразумела тое, што ўжо зараз пралетарская краіна разгортвае **шырокую падрыхтоўку** да гадавіны Кастрычніка.

Усе фронты і вучасткі сацыялістычнага будаўніцтва, усе галіны сацыялістычнай гаспадаркі будуць спатыкаць гадавіну рэвалюцыі новымі **дасягненьнямі і перамогамі**, сапраўды **ВАРТЫМІ** вялікай эпохі будаваньня сацыялізму.

Пралетарская літаратура, пралетарскі тэатр і музыка будуць сустракаць новую гадавіну Кастрычніка БАЛЬШАВІЦКІМІ МАГНІТАБУДАМІ МАСТАЦТВА.

Для больш арганізаванай і дружнай падрыхтоўкі **фронту пралетарскага мастацтва** да сьвяткаваньня Кастрычніка **Галоўмастацтвам НК БССР, ЦСПСБ, ДВБ і драмтаварыствам абвешчан КОНКУРС - СПАБОРНІЦТВА** на стварэньне лепшых твораў розных жанраў. У конкурсе - спаборніцтве навінны прыняць удзел **усе пралетарскія і савецкія пісьменьнікі, ударныя закліканыя ў літаратуру, драматургі і кампазытары. Умовы конкурсу будуць апублікаваны.**

Адказны рэдактар М. ГАРЫН.

НАРАДА ЛІТАРАТУРНАГА АКТЫВУ ПРЫ „ЗЬВЯЗЬДЗЕ"

Сёньня, 24 сакавіка, а 7 гадзіне ўвечары, у кабінэце адказнага рэдактара газэты „Зьвязда" склікаецца

НАРАДА ПА ПЫТАНЬНЯХ ЛІТАРАТУРЫ

На нараду запрашаюцца наступныя таварышы: Андрэй Александровіч, Бэнда, Барашка, Браштэйн, Барысёнак, Бучунас, Вольскі, Вярнінэўскі, Платон Галавач, Гурэвіч, Гальперына, Гарбуз, Дунец, Ітнін, Залатухін, Краўчук, Карабан, Калента, Кучар, Міхась Лынькоў, Левін, Ліхадзіеўскі, Модэль, Мурашка, Прынц, Сучкова, Швэйдэль Шапавалаў, Чарот, Чарнецкі, Харын, Хведаровіч.

„ЗЬВЯЗДА"

КІНО-ТЭАТР „ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА"

ГЭТЫМІ ДНЯМІ выпуск гукавога мастацкага фільму „МЕЖРАБПОМФИЛЬМ"

ДЗЬВЕ СУСТРЭЧЫ

ДРАМА Ў 7 ЧАСТКАХ.

Чырвоная Зорка — АПОШНІЯ СЭНСАЦЫІ СЭП Вытворч. „Госвоенкино"

Інтэрнацыянал — Мастацкі фільм вытворч. Саюзкіно БЛАКІТНЫ ЭКСПРЭС

ПРАЛЕТАРЫ — ПАТ І ПАТАШОН у навадзе ПАТАШОН БОКСЭР (у закрытым коры)

„СПАРТАК" — Новы мастацкі фільм Востраў бегляко ў драма ў 6 час

24 сакавіка, у 7 гадзіне веч. у Беларускай Акадэміі Навук (пакой № 39,3-ці паверх) АДБУДЗЕЦЦА ПАСЯДЖЭНЬНЕ СЭКЦЫІ ЛІТАРАТУРЫ Інстытуту літаратуры і мастацтва, на якім т. В. КАЛІНОЎСКІЙ будзе прачытаны даклад—„Методыка работы з кнігай". Запрашаюцца ўдзельнікі рабочых гурткоў, выкладчыкі, студэнты і ўсе каго цікавіць тэма дакладу.

Упаўнаважаны НКСувязі пры СНК БССР даводзіць да ведама дзяржаўных і кааперацыйных устаноў і прыватных асоб, што будаўнічы Аддзел Беларускага Кіраўніцтва Сувязі і Заходня-Беларуская Канторка Цэнтрэйсувязі

ЛІКВІДАВАНЫ

функцыі іх перадаюцца новаарганізаванаму будаўнічаму Трэсту пры Беларускім Кіраўніцтве Сувязі.

Усе прэтэнзіі да гэтых устаноў будуць прымацца да 1-га красавіка 1932 г.

Пасьля гэтага тэрміну ніякія прэтэнзіі прымацца на будуць.

Беларускі дзяржаўны Інстытут прадзільных культур (у Горках) абвяшчае шэснаты прыём студэнтаў на 1-шы курс. Заявы з усімі патрэбнымі, згодна правілы прыёму, дакументамі прымаюцца да 15 красавіка. Іспыты праводзяцца з 15 па 25 красавіка. Заняткі пачынаюцца з 3-га мая. Заявы з дакументамі накіроўваюцца па адрасе: БССР, гор. Горкі, Інстытуту прадзільных культур.

Дырэктар Інстытуту БАРАНЦОЎ

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ІНСТЫТУТ КАРМОВЫХ КУЛЬТУР І АГРАХЭМІІ (у ГОРКАХ) абвяшчае ВЕСНАВЫ ПРЫЁМ студэнтаў на 1-шы курс Інстытуту, а таксама на 5-месячныя курсы па падрыхтоўцы ў ВНУ.

Заявы з усімі патрэбнымі, згодна правіл прыёму, дакументамі (аб сац. матар'яльн. стан. паступаючага і яго бацькоў, адукацыі, вайск. павін., аб узросце, здароўі, дзьве фота-карткі і г. д.) прымаюцца да 15 красавіка.

Заняткі ў Інстытуце пачынуцца з 3-V-32 г., а на падрыхтоўчых курсах—з 25-IV.

Іспыты для асоб, якія не маюць адпаведнай адукацыі, адбудуцца з 15 па 25 красавіка.

Заявы з дакументамі і на 30 кап. пашт. маркамі дасылаць на адрасе: г. Горкі, БССР, Інстытуту кармавых культур і аграхэміі.

ДЫРЭКЦЫЯ.

ІНСТЫТУТ ПРАДЗІЛЬНЫХ КУЛЬТУР абвяшчае прыём курсантаў на падрыхтоўчыя пяцімесячныя КУРСЫ (у колькасьці 90 асоб). Паступаючыя павінны мець адукацыі не ніжэй 7-годкі. Заявы прымаюцца да 15 красавіка. Заняткі пачынаюцца з 15 красавіка 1932 г. Заявы з дакументамі накіроўваюцца па адрасе: БССР г. Горкі, Інстытуту прадзільных культур. Дырэктар Інстытуту Баранцоў.

Апошнія весткі з фронту індустрыялізацыі

Сельгасмашыны

20 сакавіка **завод Гомсельмаш** выпусьціў 34 сіласарэзкі—141,7 проц., 19 сячкарань — 135, 7 проц., 18 бульбасартовак—128,5 проц. і 5 капу шынасартовак—200 проц. заданьня.

Варштаты

За дзьве дэкады сакавіка **завод імя Варашылава** выпусьціў 50 сьвідравальных варштатаў, або 71,4 проц. заданьня і адну драбілку Акмэ — 20 проц.

Стандартныя дамы

За чацьвертую пяцідзеўку сакавіка **цэх стандартных дамоў Бабруйскага дрэваапрацоўчага камбінату** выпусьціў 8,5 проц. стандартных дамоў, або 60,9 проц. заданьня.

За 20 дзён сакавіка цэхам выпушчана 40,3 дамоў, або 71,9 проц. пляну.

Будматар'ялы

За чацьвёртую пяцідзеўку сакавіка **Бабуйскі дрэваапрацоўчы камбінат** выканаў вытворчую праграму па лесацэху на 98 проц.—расьпілавана 3.495 кубаметраў сырцу; па лесазаводзе № 6 — на 106,3 проц.—расьпілавана 1.122 кубаметраў; на лесазаводзе № 7 — на 108,7 проц.—расьпілавана 848 кбм. сырцу. За гаты-ж час беларэўны цэх выпусьціў 17.579 кв. м. прадукцыі, або 130,2 проц. заданьня.

* * *

19 сакавіка **лесазавод імя Халтурына** расьпілаваў 242 кбм. сырцу, або 134,4 проц. заданьня.

* * *

21 сакавіка **камбінат «Камінтэрн»** расьпілаваў 204 кбм. сырцу, або 93,2 проц. заданьня і выпусьціў 43,4 кбм. фанэры—88 проц. заданьня.

* * *

20 сакавіка **фанэрны завод «Чырвоная Бярэзіна»** выпусьціў 1.830 дзесяткаў фанэрных сядзеньняў, што складае 108,4 проц. заданьня.

ЦЬВІКІ. 20 сакавіка дрота-цьвіковы завод **«Чырвоны Кастрычнік»** вырабіў 3.560 кгр. будаўнічых цьвікоў, што складае 55,3 проц. заданьня.

19 сакавіка **завод «Інтэрнацыянал»** выпусьціў 1.877 соцень вінтоў, або 78,2 проц. заданьня.

Угнаеньні

За чацьвертую пяцідзеўку сакавіка **крычаўскі фасфарытны завод** размалоў 80 тон фасфарытнай мукі, што складае 17,2 проц. пляну. Недавыкананьне пляну тлумачыцца тым, што руда прыбывае на завод з вялікімі перабоямі.

На БЕЛДРЭС'е

18 сакавіка **першая беларуская раённая дзяржаўная электрычная станцыя імя Сталіна** вырабіла 149.000 кілёват-гадзін энэргіі. Максымум дасягнуў 7.500 кілёват, мінімум — 4.750 кілёват, сярэдняя—6.200 кілёват.

19 сакавіка агульны выраб энэргіі па 1-ай БЕЛДРЭС складаў 176.000 кілёват-гадзін. Максымум—9.600 кілёват, мінімум—5.500 і сярэдняя — 7.300 кілёват.

20 сакавіка агульны выраб электраэнэргіі раўняўся 180.000 кілёват-гадзін, прычым максымум дасягнуў 9.000 кілёват, мінімум—6.000 і сярэдняя—7.500.

Пачынаючы з 2 сакавіка ніякіх разгрузак і аварый на станцыі ня было.

Скура

За чацьвертую пяцідзеўку сакавіка **віцебская гарбарня** выпусьціла прадукцыі на 101.420 руб., што складае 112,1 проц. заданьня.

Дакладная механіка

За чацьвертую пяцідзеўку сакавіка віцебская дзяржаўная акулярная фабрыка выпусьціла прадукцыі на 73.718 руб., што складае 114,8 проц.

АГЛЯД ДРУКУ

На адным тыдні 7 пятніц...

(*„Калгасьнік Талачыншчыны", Талачынскі раён*)

Колькі будзе два плюс два?—Сьмешнае пытаньне, шчыра зьдзівіцеся вы, — зразумела, чатыры. Дарэмна дзівіцеся. У **Талачынскім** раёне, напрыклад, здзівіліся-б ня гэтаму пытаньню, а вашаму адказу. Запытайцеся ў рэдакцыі раённай газэты **«Калгасьнік Талачыншчыны»**, колькі будзе два плюс два і вам бясспрэчна, самым сур'ёзным чынам адкажуць:

— Пяць!

З лёгкай рукі рэдакцыі «К. Т.» у Талачынскім раёне да законаў матэматыкі адносяцца з найвялікшым скэптыцызмам. Напрыклад, там упэўнены, што, скажам, лічбы 50-60 і 106 ёсьць... адпаведныя вялічыні. Гэта ня жарт, а, на жаль, сумны факт.

Прагледзьце камплекты «К. Т.», азнаёмцеся з яго некаторымі апэрацыйнымі зводкамі і вы ўбачыце, што для газэты самыя элямэнтарныя правілы матэматыкі нічога **ня значаць.** Якія там могуць быць аксыёмы, калі «К. Т.» у сваіх паасобных матар'ялах з усёй сур'ёзнасьцю сьцьвярджае, што, напрыклад, для поўнага выкананьня пляну збожжазагатовак зусім ня трэба выканаць гэты плян на 100 проц. Даволі дабіцца, скажам, 50-60 проц. і можна лічыць, што плян... перавыкапан.

Яркая ілюстрацыя: апэрацыйная зводка газэты паведамляе, што ў **Палодаўскім** сельсавеце калгасы выканалі плян збожжазагатовак на **84%**, адназасобнікі — на **46,3%**, а цьвёрдыя заданьні спагнаны ў разьмеры **25,7%. ВЫВАД «К. Т.»** — сельсавет выканаў плян на... **106%** (№ 1 (38) 1932 г.).

Чаму? Якім гэта чынам у сельсавеце, дзе, паводле слоў самой газэты, ні адзін сэктар **НЯ ВЫКАНАЎ ПЛЯНУ** збожжазагатовак, а цьвёрдыя заданьні спагнаны толькі на 25 проц., збожжазагатоўчы плян абвяшчаецца... перавыкананым. Што за недарэчнасьць!

Аналёгічнай апошні заслужылі ад рэдакцыі і іншыя некаторыя сельсаветы. Апэрацыйная зводка «К. Т.» амаль уся складаецца з самых, так сказаць, фэнамэнальных парадоксаў. У трох першых графах зводкі лічбы б'юць трывогу, а ў чацьвертай і апошняй графе, як правіла, паведамляюць аб... перавыкананьні пляну. У Друцкім сельсавеце, паводле зводкі, **ні адзін сэктар свайго пляну ня выканаў.** Тым ня менш газэта тут-жа сьцьвярджае, што сельсавет выканаў плян збожжазагатовак на... **126%.**

Матэматычныя падлікі апэрацыйнай зводкі здольны паразіць самага выдатнага матэматыка: раз калгасы выканалі плян па **97%**, адназасобнікі — на **84,7%** і цьвёрдыя заданьні спагнаны ў разьмеры 79,3%, значыць... 126 проц. пляну па сельсавеце ёсьць.

Сутнасьць справы, аднак, ня ў гэтай анэкдатычнай зводцы, якая жанглюе лічбамі, узятымі невядома адкуль. Само сабой зразумела, што зусім **недапушчальна штампаваць фальшывыя лічбы і тым самым ДЗЗАРЫЕН ТАВАЦЬ МАСЫ.** На жаль, падобныя факты ў той ці іншай форме паўтараюцца ў газэце **ДАВОЛІ ЧАСТА.** Прыкладам могуць служыць матар'ялы «К. Т.», прысьвечаныя барацьбе за насьпенфонды.

Да сакавіка аб насеньні газэта фактычна нічога ня пісала. Аб іх «К. Т.», калі хочаце, толькі ўспамінаў у лёзунгах і аншлягах. Разгорнутых матар'ялаў зусім ня было. Гэта можна прасачыць у храналёгічным парадку.

8 ЛЮТАГА («К. Т.», № 8). У газэце аб насенных фондах няма ні аднаго слова.

13 ЛЮТАГА («К. Т.», № 9). Даецца лёзунг:

«НАСЕНЬНЕ, КАНЯ, ТРАКТАР І ПРЫЛАДЫ — У БАЯВУЮ ГАТОЎНАСЬЦЬ».

Пад лёзунгам зьмяшчаецца некалькі заметак, у якіх аб насеньні амаль нічога няма. Газэта толькі коратка адзначае, што райземаддзел ня мае

«... ніякіх вестак аб ходзе рамонту, зборы попелу і ачыстцы насеньня»...

17 ЛЮТАГА («К. Т.», № 10). Гісторыя паўтараецца. Газэта зноў толькі мімаходам успамінае аб насенных фондах:

«... у райнаргассаюзе няма вестак, ці па ўсіх калгасах створаны насенныя і страхавыя фонды».

Больш нічога!

23 ЛЮТАГА («К. Т.», № 11). Зьмяшчаецца баявы лёзунг: «Стварэньне калгасных насенных фондаў — цэнтральная задача дня». Пад лёзунгам — зводка, а ў зводцы — **ТРЫВОЖНЫЯ ЛІЧБЫ: 40,7; 19,1 і 9,5.** Гэта — паказальнікі выкананьня пляну ссыпкі насьпенфондаў па збожжавых, тэхнічных і кармовых культурах (у процантах).

Ня думайце, аднак, што газэта дае хаця-б які-небудзь аналіз зводкі. Нічога падобнага. У нумары акрамя лёзунгу і зводкі ніякіх іншых матар'ялаў аб насенных фондах няма, калі ня лічыць перадрукаванай тэлеграмы ЦК КП(б)Б і СНК БССР.

2 САКАВІКА («К. Т.», № 13). Пі аднаго радка апэрацыйнага матар'ялу аб насенных фондах. Праўда, перадавая газэты прысьвечана гэтаму пытаньню, але яна носіць выключна агульны характар.

«ПА НАШЫМ РАЁНЕ — пішэ рэдакцыю. Вышэй «К. Т.» сьцьвярджае, што ў **Талачынскім** сельсавеце калгасы поўнасьцю ссыпалі насенныя і страхавыя фонды, а ніжэй у заметцы аб калгасе «13-годзьдзе Кастрычніцкай рэвалюцыі» гэтага-ж **сельсавету** пішэ, што тут

«... НАСЕННЫЯ І СТРАХАВЫЯ ФОНДЫ НЯ ССЫПАНЫ, НІ АДНО КІЛЕ НАСЕНЬНЯ НЕ АЧЫШЧАНА».

Як гаворыцца, правая рука ня ведае, што робіць левая. Чаму верыць?

Сапраўды, чаму верыць? У адным нумары рэдакцыя адносіць **ВОЎКАЎСКІ** сельсавет да тых сельсаветаў, якія

«... НЕДАЦЭНЬВАЮЦЬ ПАЛІТЫЧНАГА ЗНАЧЭНЬНЯ ГЭТАЙ ВАЖНЕЙШАЙ КАМПАНІІ (ссыпкі насьпенфондаў. Рэд.)». («К. Т.», № 14).

У наступным нумары чытача чакае сюрпрыз. Воўкаўскі савет раптоўна залічваецца ў **перадавыя** сельсаветы, бо

«... асабліва ўвага зьвернута з боку сельсавету на збор насенных і страхавых фондаў» («К. Т.», № 15).

У адным нумары газэта выстаўляе **СЛАВЕНСКІ** сельсавет у рады тых сельсаветаў, якія

«... ПА-БАЛЬШАВІЦКУ РАЗГАРНУЛІ РАБОТУ І ПАСТАВІЛІ У ЦЭНТР УВАГІ ССЫПКУ НАСЕННЫХ І СТРАХАВЫХ ФОНДАЎ» («К. Т.», № 15).

А ў другім... газэта розка абвінавачвае гэты самы сельсавет у

«... апартуністычнай бязьдзейнасьці і бездакназнасьці» («К. Т.» № 16).

На адным тыдні 7 пятніц!

* * *

«К.Т.» за апошні час пачаў разгортваць масавую работу. У сельсаветы пасланы брыгады. У раёне па ініцыятыве газэты праведзена першая агразоатэхнічная канфэрэнцыя. Але гэта толькі першыя зрухі. Газэта змагаецца за насеньне пакуль што абсалютна НЕЗДАВАЛЬНЯЮЧА. Рэдакцыя павінна раз назаўсёды адмовіцца ад замілаваньня агульнымі фразамі і з сапраўднай адказнасьцю адносіцца да тых матар'ялаў, якія яна зьмяшчае на старонках газэты.

Даводзіцца да ведама ўсіх падпісчыкаў часопісі „УЗВЫШША", што ў 1932 г. часопіс „УЗВЫШША" ня будзе выходзіць.

Замест не пачынае выходзіць новая часопіс—орган аб'яднаньня пролетарскіх калгасных пісьменьнікаў

„БЕЛАРУСЬ КАЛГАСНАЯ"

Пад рэдакцыяй: С. Баранавых, Іл. Барашка, П. Галавача і Н. Міхайлава.

ПАДПІСНАЯ ЦАНА:
На 1 год—3 руб. 60 кап.
На 6 мес.—1 руб. 80 кап.
На 3 мес. — 90 кап.
На 1 мес. — 30 кап.

Падпіска прымаецца: Усімі гарбюро і райбюро Саюздруку, паштовымі агэнцтвамі сувязі і лістаносцамі.

УСЕ падпісчыкі часопісі „У З В Ы Ш Ш А", якія падпісаліся на 1932 г., могуць перавесьці сваю падпіску на часопіс „БЕЛАРУСЬ КАЛГАСНАЯ", згодна ўнесеных сум, аб чым трэба паведаміць гарбюро або райбюро Саюздруку на месцах.

Мінск, друкарня «Зьвязды». Папраўлітбел № 337.